№ 136 (2324) ПЯТНІЦА, 15-га ЧЭРВЕНЯ 1928 г. САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ КОШТ НУМАРУ 5 кап.

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 479. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз. Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не адсылаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Замена адрасу: іншагародняя	— 20 к.
мясцовая	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АББЕСТКІ:

За радок пайпаралі пасьля тэксту	— р. 50 к.
За радок пайпаралі пасьлядо тэксту	1 р. — к.
За радок пайпаралі поруч з тэкстам	1 р. 50 к.

Сьпецыяльныя на 50 проц. даражэй. Зямля тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумэнт	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумэнт	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГСу—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АББЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 136 (2324) Пятніца, 15-га чэрвеня 1928 г.

Англа-італьянскія дачыненьні і Польшча.

Польска-літоўскі канфлікт, бясспрэчна, займаў цэнтральнае месца ў парадку дню 50-й «юбілейнай» сэсіі рады Лігі Нацый. Аб гэтым сьведчаць ня толькі справаздачы аб адчыненых пасяджэньнях і ўхваленьне рэзалюцыі, але, галоўным чынам, весткі аб „прыватных" парадах, якія адбыліся ў Жэневе між заправіламі Лігі. Ці-ж трэба яшчэ падкрэсьліваць, што іменна гэтыя «прыватныя» гутаркі, а не ўрачыстыя адкрытыя сэансы, маюць рашаючае значэньне ў Жэневе. Аднак, на гэтай сэсіі прыватнае і афіцыйнае складалі адно арганічна цэлае.

Чаму?

Адказ ясны: вялікія апекуны фашысцкай Польскай рэспублікі мелі важкія прычыны, так сказаць, вычесьці на вуліцу ўсю вострасьць канфлікту і нажыцца, такім чынам, па лініі міратворчасьці.

І сапраўды. Калі Вальдэмараас, які ўключыў у праэкт літоўскай канстытуцыі артыкул пра Вільню, як сталіцу Літвы, выкрыты перад усім сьветам, як «правакатар», як несьвядомая, сьляпая зброя ў руках... Масквы,—дык тыя, хто яго выкрывае і, выкрываючы, заклікаюць да парадку і разважаньня,—лішні раз абкружаюць сябе арэолам сапраўдных міратворцаў.

Гэта—агульнапалітычны фон вуснае спрэчкі Чэмбэрлена з Вальдэмарасам. Але асноўная яе сутнасьць усё-ж складаецца з таго, што апекунам Польшчы ўдалося (ці ўдалося-ж?) шляхам мэханічнага звужэньня канфлікту адцягнуць увагу шырокіх мас ад галоўнейшых імпэрыялістычных установак Англіі і яе прыяцеляў.

Пытаньне пра Вільню ў вачох Чэмбэрлена, зразумела, ня варта касьцей хоць-бы аднаго шатляндзкага грэнадэра; гэтас-ж пытаньне, узятае ў арганічным параўнаньні з агульнай устаноўкай брытанскага імпэрыялізму ў адносіне да СССР, мае кардынальна важнае значэньне. Але Чэмбэрлену ня выгадна, каб іменна гэты апошні момант да пары вывіўся перад ангельскай-жа грамадзкай думкай ва ўсёй сваёй недарэчнасьці. Адгэтуль—падкрэсьліваньне націску на Вальдэмараса, як на «правакатара-падбухторшчыка».

Успомнім, дарэчы, што ў ліпэўскія і жнівеньскія дні 1914 году пытаньне аб Бэльгіі, як асноўнай прычыне для ўступленьня Англіі ў сусьветную бойню, было высунута лёндэнскімі дыпляматамі толькі ў самую апошнюю хвіліну, а між тым усе навейшыя досьледы, у тым ліку першы том дакумэнтаў ангельскага міністэрства замежных спраў, паказваюць, што бэльгійскае пытаньне амаль ня цэлае дзесяцігодзьдзе хавалася Лёндэнам, як асноўны цыплёматычны «інструмант» вайны. І наўрад хто-небудзь западазрыць сёньня Чэмбэрлена ў адступленьні ад слаўных традыцый сэра Эдварда Грэя.

Але калі трэба было яшчэ даводзіць што націск на Вальдэмараса быў зроблен іменна з мэтаю мэханічнага звужэньня польска-літоўскага канфлікту, дык гэткі доказ дадзен,—бадай, наперакор жаданьням Чэмбэрлена—яго шчырым прыяцелем, правадыром фашысцкай Італіі. Мы маем тут на ўвазе прамову Мусаліні аб замежнай палітыцы Італіі, якая была зроблена ў сэнаце 5 чэрвеня і толькі ў кароткіх рысах перададзеную тэлеграмамі з Рыму. Гэта надзвычайна цікавая па зьместу прамова, якая можа служыць довадам англійска-італьянскага супрацоўніцтва ня толькі ў дунайска-балканскай Эўропе, але і „зачумлённым" усходнім яе сэктары.

Мусаліні, закрануўшы італа-польскія дачыненьні і ніадэўне падарожжа Залескага ў Рым, заявіў: (мы падаем літаральна водлуг слоў фашысцкага афіцыёзу «Пополо д'Італія» ад 6-га чэрвеня):

«Маё спатканьне з Залескім было надзвычайна карыснае, таму што з абмену думак і з аналізу эўрапейскіх абставін выцякае магчымасьць супольнай (італа-польскае) акцыі,—зразумела мірнае, у вядомым напрамку і для пэўных эвэнтуальнасьцяй. У Італіі і Польшчы маецца даволі прычын—гістарычных, культурных і эканамічных для карыснага супрацоўніцтва».

Сказана больш, чым ясна. Не хапала толькі, каб правадыр фашызму вызначыў і геаграфічныя пункты свайго супрацоўніцтва з Польшчаю і ўстанавіў-бы той «просты італьянскі провад» паміж Албаніяй і Літвой, які, водлуг слоў польскага друку, з аднаго боку, даў бы магчымасьць Польшчы раз назаўсёды пазбавіцца літоўскай «балячкі», а з другога,—даў-бы і Італіі магчымасьць ажыцьцёвіць свой пратэктарат над Албаніяй.

Але, між іншым, сам Мусаліні ў другой частцы сваёй прамовы лічыў патрэбным падкрэсьліць, што яго супрацоўніцтва з фашысцкай Польшчай зьяўляецца толькі часткай яго шчыльнага супрацоўніцтва з Англіяй.

І вось гэта прыязьнь з Польшчай, супрацоўніцтва з ёй ў пэўным напрамку складае толькі частку італьянскага шчыльнага супрацоўніцтва з Лёнданам у тых-жа напрамках.

І паказальна, што гэта прамова фашызму была зроблена якраз у той самы час, калі Чэмбэрлен кваліфікаваў Вальдэмараса як «правакатара-падбухторшчыка». Чэмбэрлен «звужваў» канфлікт у польска-літоўскіх узаемаадносінах, Мусаліні-ж яго пашыраў.

Пачатак бурны.

Калі зрабіліся вядомымі вынікі выбараў у агульнанямецкі парлямант, буржуазная нямецкая газэта «Тэгліхэ Рундшау» пісала:

«Больш трох з чвэрткаю міліёнаў нямецкіх рабочых накіраваліся на выбары пад лёзунгам «Баранціе Савецкі Саюз», г. зн. баронячы чужыя інтарэсы і выступаючы за зьнішчэньне ўласнае дзяржавы. Якое сумнае, якое пагражаючае прадказаньне часу».

«Прадказаньне» — дак, сапраўды, пагражаючае і ня толькі для нямецкае буржуазеі. Кракадзілавыя-ж сьлёзы аб «памыляючыхся» 3-х міліёнаў з лішкам нямецкіх рабочых трэба раней усяго аднесьці за кошт суму аб тым, што гэтыя-ж тры міліёны заўсёды гатовы змагацца і за сваіх абраных—дэпутатаў-камуністаў.

Змагацца як за іх, так і за права на адкрытае існаваньне камуністычнае партыі. Змагацца проці спробаў буржуазнага ўраду абвясьціць гэтую партыю па-за законам, проці спробаў загнаць яе ў падполье.

Спробы такія робяцца і зараз. Прыклад—агідная пастанова вярхоўнага дзяржаўнага суду ў Лепцыгу, які разглядаў справу па абвінавачаньні «ў дзяржаўнай здрадзе» рэдактара камуністычнае газэты «Ротэ Фанэ»—Бэглера. Суд, як паведамляла ўчора «Беднота», адмовіўся дапусьціць у якасьці абаронцы Бэглера адваката Замтэра. Адмовіўся таму, што і Замтэр западозрываўся ў тым-жа самым, што і Бэглер, таму, што Бэглер—член нямецкае камуністычнае партыі».

Іншымі словамі, «у дзяржаўнай здрадзе» абвінавачваецца цэлая партыя. І калі-б ня тры міліёны з чвэрткаю галасоў, пададзеных на выбарах за гэтую «здрадзячую дзяржаве» камуністычную партыю, дык ніякай Італіі, Румыніі ці іншым душыцелям рэвалюцыйнага рабочага руху не зраўнацца-б з учынкамі нямецкіх фашыстаў.

Але тры міліёны, гэта—моц. Згуртаваная. Ясна бачачая, дзе клясавы вораг, з кім трэба змагацца. І гатовая змагацца.

Гэта ясна выкрылася на адчыненьні прускага парляманту. (Нямеччына падзяляецца на некалькі вобласьцяў з сваімі вобласнымі парлямантамі. Агульнанямецкі парлямант адчыніцца ў сярэдзіне чэрвеня).

Адчыніўшы пасяджэньне прускага парляманту, граф Пазадоўскі-Вэнэр заявіў:

«Абавязкам, і дбўгам ўраду зьяўляецца абарона існуючага дзяржаўнага ладу проці ўсякае спробы зьнішчыць яго, шляхам гвалту».

Можна было-б разглядаць гэтыя словы, як выступленьне прамоўцы, калі-б парлямант зьяўляўся сходам прадстаўнікоў аднае клясы, аднолькавых інтарэсаў. Але ў прускім парлямансе, таксама як і ў будучым агульнанямецкім, апрача прадстаўнікоў буржуазных партый і іх паслугачоў-меншавікоў, ёсьць дэпутаты-камуністы. І яны неадкладна далі іншую ацэнку як словам графа Пазадоўскага, так і таму буржуазнаму ўраду, які ён меў на ўвазе. Пачуліся выгукі:

— Прэч урад.

— Забойцы рабочых.

— Амністыю.

Амністыю дэпутаты-камуністы патрабавалі перш за ўсё для двох абраных у дэпутаты камуністаў, якія сядзяць яшчэ ў нямецкай турме. Але, апроч таго, камуністы патрабавалі ўсеагульнай палітычнай амністыі (вызваленьня з турмаў і спыненьня судовага праследваньня) для пралетарскіх зьняволеных.

Патрабаваньні дэпутатаў-камуністаў прывялі парлямант да бойкі, прычым «шляхетная» галава буржуазнага дэпутата Панфіка значна пацярпела.

Пасьля бойкі прапанова камуністаў галасавалася,—і перамагла. Перамагла таму, што дэпутаты-меншавікі змушаны былі падтрымаць яе. Што інакш казалі-б пра іх тыя рабочыя, якія яшчэ канчаткова ня страцілі ў іх веру? Што казалі-б тыя рабочыя, якія прысутнічалі на адчыненьні прускага парляманту?

Але гэтыя рабочыя і так сказалі сваё слова. Іх прадстаўнік выступіў з прамоваю, якую скончыў словамі:

— Няхай жыве пралетарская рэвалюцыя!

21 мая, пасьля скончэньня выбараў, буржуазная нямецкая газэта «Берлінэр Бэрзэцэйтунг» пісала:

— Сёньня ў Маскве палілі сьвяточныя вогнішчы. Масква сьвяткуе з прычыны перамогі нямецкіх камуністаў.

Хоць май у нас вышаў і не гарачы, але вогнішчаў у Маскве не раскладалі. Але мы думаем, што нямецкай буржуазеі цяпер, у чэрвені, робіцца ўжо холадна ад прадчуваньня блізкіх боек з нямецкім пралетарыятам.

І калі ўжо казаць пра кастры, дык упору іх раскладаць нямецкай буржуазеі. Раім ёй гэты сродак:

— Пагрэйцеся і—пасушыцеся.

С.

Адчыненьне новага нямецкага рэйхстагу.

НА ЧАРЗЕ ДНЯ ПРАПАНОВА КАМУНІСТАЎ АБ АМНІСТЫІ.

БЭРЛІН, 13-6. 13-га чэрвеня адбылося першае пасяджэньне рэйхстагу новага складу. Пасяджэньне было прысьвечана выключна фармальным пытаньням і адбылося ў спакойных умовах.

Пасьля афіцыйнага адчыненьня рэйхстагу камфракцыя падала прапанову аб амністыі. Прапанова без пярэчаньняў уключана ў парадак дню заўтрашняга пасяджэньня. Таксама ўключана ў парадак дню заўтрашняга пасяджэньня прапанова аб амністыі, пададзеная нацыяналістамі. У процівагу камуністычнай прапанове аб амністыі, прапанова нацыяналістаў распаўсюджвае амністыю на віноўнікаў тайных забойстваў, у т. зв. чорным рэйхсвэры, але выключае з амністыі асоб, вінаватых у „дзяржаўнай здрадзе".

Камуністычныя дэпутаты Штэкер, Эвэрт, Кенэн і Пфэйфер, адносна яніх бесьць загад аб арышце, прайшлі ў рэйхстаг яшчэ да поўдню, каб ухіліцца ад арышту. З сёньняшняга дню яны карыстаюцца ўжо дэпутацкай недатычнасьцю.

На заўтрашнім пасяджэньні павінны адбыцца выбары прэзыдыуму рэйхстагу. Камфракцыя высоўвае ўласнага кандыдата Тэльмана на пасаду старшыні рэйхстагу проці сацыял-дэмакратычнага кандыдата Лебэ. У выпадку, калі сацыял-дэмакраты ажыцьцёвяць сваю пастанову, у якасьці «меры ўздзеяньня» проці назначэньня самастойнага камуністычнага кандыдата, устрымацца ад галасаваньня пры абраньні трэцяга таварыша старшыні, дык месца камуністычнага кандыдата на пасадзе трэцяга таварыша старшыні займае кандыдат народнае партыі.

Папярэдні склад урадавае кааліцыі.

БЭРЛІН, 13-VI. У выніку папярэдніх перамоў сацыял-дэмакратычнага лідэра Мюльлера з лідэрамі буржуазных партый выявілася, што дэмакраты, цэнтр, народная партыя і баварская народная партыя *ў прынцыпе згодны ўдзельнічаць у будучай урадавай кааліцыі. Гаспадарчая партыя дала адмоўны адказ.* Штрэзэман, Куртыюс і Грэнер выказалі гатоўнасьць захаваць свае партфэлі і ў будучым урадзе.

Меншавіцкае палітыканства.

БЭРЛІН, 13-6. Будучы 4-й па колькасьці дэпутатаў партыяй рэйхстагу, кампартыя патрабуе, каб пасада трэцяга намесьніка старшыні была дадзена ёй ня толькі ў ляндтазе, але і ў рэйхстазе.

Сацыял-дэмакратычная фракцыя пастанавіла падтрымаць гэтае патрабаваньне кампартыі толькі ў тым выпадку, калі камуністычная фракцыя прызнае рэгляманд і будзе галасаваць за кандыдатаў, высунутых на іншыя пасады ў прэзыдыуме. Калі-ж камуністы высунуць проці Лебэ ўласнага кандыдата на пасаду старшыні рэйхстагу, дык сацыял-дэмакраты ўстрымаецца ад галасаваньня і тым самым правалюць камуністычныя кандыдатуры.

Камфракцыя рэйхстагу сфармавалася.

БЭРЛІН. 14-га чэрвеня камфракцыя рэйхстагу афіцыйна сфармавалася. Старшынямі фракцыі абраны Тэльман і Штэкер, сябрамі прэзыдыуму—Дэнгель, Эвэрт, Гелейн, Кенэн, Пік, Пэк, Шнэлер і Торглі, сакратаром—Арэндээ.

Перагляд справы Макса Гельца.

БЭРЛІН, 13-VI. Водлуг паведамленьня „Берлінэр Тагеблят" з Лейпцыгу, вярхоўны прамурор задаволіў хадайніцтва аб перагляде справы Макса Гельца. Канчатковае вырашэньне залежыць ад крымінальнага сэнату, думка якога па гэтай справе яшчэ невядома.

Дэлегацыі рабочых у рэйхстазе.

БЭРЛІН. У дзень адчыненьня ў рэйхстаг наведаліся рабочыя дэлегацыі 24-х буйных прадпрыёмстваў Бэрліну, а таксама дэлегацыі жонак палітычных вязьняў. Дэлегаты мелі гутарку з фракцыямі камуністаў, сацыял-дэмакратаў і партыі цэнтру, прычым патрабавалі поўнае амністыі для палітычных вязьняў. Некаторыя рабочыя дэлегаты сацыял-дэмакраты выказваліся проці кааліцыі, прапануючы сацыял-дэмакратычнай фракцыі падтрымліваць пралетарскія дамаганьні кампартыі.

Ад імя камфракцыі Гелейн адказаў дэлегатам камфракцыі рэйхстагу, што яна імкнецца дамагчыся амністыі для ўсіх пралетарскіх палітычных вязьняў. Прадстаўнік сацыял-дэмакратычнае фракцыі Ляндэбэрг заверыў дэлегатаў, што амністыя ахопіць усе злачынствы, учыненыя ў часе інфляцыі, а таксама злачынствы, кваліфікаваныя, як дзяржаўная здрада. Што-ж датычыць Макса Гельца і Маргіса, дык воля ім можа быць дадзена толькі спэцыяльным актам дараваньня віны.

УСЕАГУЛЬНАЯ СТАЧКА ВОДНІКАЎ НА РЭЙНЕ.

БЭРЛІН, 11-VI. Бастуючыя рэйнскія воднікі пастанавілі аднагодна адхіліць пастанову трацейскага суду. Забастоўка ня спыняецца. Да забастоўкі далучыліся каманды 9-ці параходаў, абслугоўваючых суднаходзтва па канаве Рэйн-Вэрнэ, у зьвязку з чым спыняецца перавозка вугалю з каменнавугольных копяй у рэйнскія парты. З прычыны спыненьня судаходзтва па канаве, бліжэйшымі днямі спыніцца французкае і бэльгійскае суднаходзтва па Рэйне.

У колах бастуючых чакаюць, што воднікі, абслугоўваючыя канавы Дормунд-Эмс і Эмс-Везэр, абвесьцяць забастоўку салідарнасьці. У гэтым выпадку ўсё суднаходзтва Заходняе Нямеччыны будзе паралізавана.

Падрабязнасьці аварыі „Італіі".

ПАРЫЖ, 13-VI. Водлуг паведамленьняў агенцтва Гавас, «Чытта-ды-Мілана» заснавала рэгулярную сувязь з Нобіле, прычым ёй удалося выявіць падрабязнасьці аварыі «Італіі». Катастрофа здарылася 25-га мая, а 10 гадзіне 30 хв. раніцы, калі дырыжабаль набліжаўся да паўночна-ўсходняе зямлі Шпіцбэргену. З прычыны абледзяненьня абалочкі, вага дырыжаблю павялічылася, і ён пачаў хутка зьнікацца. Пры зьнімэньні на лёд, гандола дырыжаблю разьбілася і аддзялілася ад абалочкі. У гандоле знаходзілася частка экіпажу, у тым ліку і Нобіле.

Пазбавіўшыся ад цяжару гандолы, дырыжабль узьвіўся ў паветра і палянеў у напрамку на ўсход. На адлегласьці 30 клм. ад месца катастрофы, дырыжабль канчаткова зьнізіўся. Усе ўдзельнікі экспэдыцыі, якія знаходзіліся ў гандоле, не зважаючы на зруйнаваньне гандолы, заталіся жывымі. Двое з каманды параненых.

30-га мая ўдзельнікі экспэдыцыі Таці і Мальгрэм накіраваліся ў напрамку да паўночнага пункту паўночна-ўсходняе зямлі, маркуючы праходзіць у дзень палёту 10 кілёмэтраў. Іншыя ўдзельнікі экспэдыцыі засталіся на разьбітае гандолы.

Група Нобіле мае прадуктаў на 3 месяцы. Становішча параненых здавальняючае. Лёс іншае групы экіпажу, якую аднесла на ўсход, невядомы.

НА «КРАСІНЕ» ЕДЗЕ ІТАЛЬЯНСКІ КАРЭСПАНДЭНТ.

МАСКВА, 13-VI. Камітэт дапамогі Нобіле дазволіў карэспандэнту італьянскае прэсы пану Сэссу накіравацца на «Красіне» на адшуканьне экспэдыцыі Нобіле.

Нобіле чакае савецкае экспэдыцыі.

МАСКВА, 13-VI „Чытта-ды-Мілана" паведаміла ўчора камітэт дапамогі Нобіле, што каманда дырыжаблю, чакаючы савецкія лёдаколы і самалёты, паставіць чырвоную палатку каля таго месца, дзе яна знаходзіцца, ці дасьць аб сабе ведаць іншымі моцнавідзімымі сыгналамі.

Узьнікае небясьпека, што зарадка акумулятараў у экспэдыцыі Нобіле ўжо канчаецца. Гэта можа ўскладніць сувязь з Нобіле па радыё.

* * *

МАСКВА, 13-VI. Камітэт дапамогі Нобіле атрымаў апошнія весткі аб становішчы экіпажу „Італіі". Група, у якой знаходзіцца Нобіле, прасоўваецца па лёдзе ўздоўж паўночнага берагу выспы Нордэст на захад. За трое сутак група пакрыла адлегласьць ніля 18 клм. Аб лёсе другой групы, якая засталася на крызе, ніякіх вестак няма, а таксама і аб 3-х членах экспэдыцыі, якія накіраваліся да Паўночнага носу.

У Саюзе ССР.

На пленуме УсеЦСПС.

Інжынэрства мусіць пераглядзець сваю лінію.

Выступленьне т. Томскага.

МАСКВА, 13-VI. 13 чэрвеня на пасяджэньні пленуму УсеЦСПС у спрэчках па дакладу Шэйна выступіў тав. Томскі, які ў сваёй прамове ахарактарызаваў асноўныя задачы інжынэрства ў сучасны момант.

Шахцінская справа—казаў тав. Томскі—паявіла прымусіць наша інжынэрства і ІТС (Інжынэрна-Тэхнічная Сэкцыя) пераглядзець сваю лінію. Я ўпэўнен, што група шахцінскіх шкоднікаў—пасьлядоўны контрэвалюцыйных элементаў сярод інжынэрства. Але нічым не замажаш таго факту, што на самым галоўным участку нашага гаспадарчага будаўніцтва выкрыты шкоднікі, сярод якіх апынуліся таксама людзі, якія стаялі на чале ІТС.

Тав. Томскі бачыць асноўную прычыну контрэвалюцыйных настроіў частні інжынэрства ў адрыве спэцыялістаў ад працы мас. Наш курс,—кажа тав. Томскі—на зблізьненьне інжынэрства з рабочымі. Мы робім пэўныя ўступкі спэцыялістам, лічымся з тымі адсталымі поглядамі, якімі значная іх частка праясняута. Але адначасна мы імкнемся, каб адмежаваньне, якая стварылася між інжынэрствам і рабочымі, зьменшылася, а некаторая частка спэцыялістаў, наадварот, імкнецца гэту адмежаваньне быццам узаконіць, дамагаючыся для інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў нейкіх асобных правоў і прывілеяў. Гэткая лінія ставіць інжынэрства ў ізаляванае становішча і прыводзіць да шкоднай каставаньні. НЯ МОЖА БЫЦЬ ПРАВОЎ БЕЗ АБАВЯЗКАЎ. А між тым сярод спэцыялістаў яшчэ досыць моцны мяшчанскія настроі, якія штурхаюць інжынэрства на няправільны шлях барацьбы выключна за свае матар'яльна-бытавыя інтарэсы. Рвацкім настроям, «язунгам наштэт—„усе правы, але ніякіх абавязкаў"—мы паявіны даць ідэёвы, чарвальны і арганізацыйны адпор.

Характар нашага беспрацоўя.

З дакладу т. Гінзбурга.

МАСКВА. Учора пленум УсеЦСПС заслухаў два даклады—загадчыка ОТЭ УсеЦСПС т. Гінзбурга аб выніках усесаюзнага перапісу беспрацоўных і Народнага Камісара працы т. Шмідта аб рабоце бірж працы.

Даныя перапісі паказваюць,—кажа т. Гінзбург,—што на 1 кастрычніка 1927 г. беспрацоўных рабочых і служачых на ўсёй тэрыторыі СССР налічвалася паўтара міліёны. У гэты лік уваходзіла 500 тысяч сэзонных рабочых, беспрацоўе якіх у пэўныя пэрыяды—нармальнае зьявішча.

Асаблівы характар беспрацоўя ў нашай краіне ў тым, што яно ідзе поруч з штогоднім прыростам рабочых у буйнай прамысловасьці. Так, за апошнія 3 гады ў буйную вытворчасьць уліваецца штогодня менш 100 тысяч чалавек. Сур'ёзнаю цяжкасьцю ў барацьбе з беспрацоўем т. Гінзбург лічыць надзвычайна частыя зьмены складу рабочых у прамысловых прадпрыёмствах, пры бязупынным прытоку ў вытворчасьць неарганізаванае рабочае сілы.

Распускныя прафіраўнікі.

АДЭСА, 12-6. ДПУ і РСІ выкрылі злоўжываньні ў саюзе камунальнікаў. Група кіруючых працаўнікоў з старшынёю акрадзяленьня Мазурэкам і загадчыкам акрбюро Багданавым увяла ў саюзе сыстэму пратэкцыянізму і стварыла абставіны развалу і распусты. Выяўлена, што беспрацоўных жанчын за пасылку на працу адказныя працаўнікі примушалі жыць з імі.

Бюро акрпарткому прапанавала распусьціць ольдэтва ла сорасе арыштаваных Мазурэка і Багданава і інш. адказных працаўнікоў акрадзяленьня. Фракцыям акрвыканкому і акрпрафсавету даручана праверыць увесь склад працаўнікоў акрсрэдбюро і вызваліць яго ад нягодных элементаў, распусьціць праўленьне акрадзяленьня камунальнікаў і скліканць тэрміновы зьезд саюзу для выбару новага праўленьня.

У Пекіне ўсё па старому.

ЧАНКАЙШЫСТЫ—ВАРТЫЯ ПАСЬЛЯДОЎЦЫ ЧЖАН-ЦЗО-ЛІНА.

ШАНХАЙ, 13-VI. Міністэрства замежных спраў нанкінскага ўраду тэлеграфна паведаміла асабовы склад усіх кітайскіх пасольстваў заграніцаю заставацца на сваіх пасадах, узьняўшы гаміндаўскі сьцяг.

Водлуг паведамленьняў тэлеграфнага агенцтва Тохо, Ен-Сі-шан дамагаецца высяленьня паліцыі з Пекіну і радзіць Чан-Кайшы пераехаць у Пекін.

Гвалтоўнае прыдушэньне шанхайскае стачкі.

ШАНХАЙ, 13-VI. Начальнік шанхайскага гарнізону загадаў бастуючым рабочым шоўкапрадзільняў спыніць забастоўку ў працягу 3-х дзён, у іншым разе прафсаюз, кіруючы забастоўкай, будзе распушчан, а бастуючыя будуць пакараны.

ПЕКІН І ЦЯНЦЬЗІН ПАД УЛАДАЮ ЕН-СІ-ШАНА.

ПЕКІН, 13-VI. Ен-Сі-Шан афіцыйна паведаміў пасланьнікаў Галяндыі, Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў, Англіі, Японіі, Італіі і Францыі, што ён прыняў выкананьне абавязкаў начальніка гарнізонаў у Пекіне і Цянцьзіне.

Наступ на Мукдэн.

ПЕКІН, 14-VI. Чыгуначныя зносіны з Цянцьзінам і Шанхаем адноўлены. Паўднёвае войска атрымала загад пасоўвацца на Мукдэн уздоўж чыгункі, устрымліваючыся ад баявых апэрацый у 10-цікілёмэтравай зоне, якая прылягае непасрэдна да палатна.

ПРЫДУШЭНЬНЕ РУМЫНСКІХ ГАРНЯКОЎ.

ВЕНА, 13-VI. Як паведамляюць з Бухарэсту, забастоўка гарнякоў у Жылаве ня спыняецца. Румынскія сацыял-дэмакратычныя рады паведамляюць, што між бастуючымі і вайсковымі часьцямі адбылася стычка, у выніку якое забіта 7 чалавек, 2 жанчыны цяжка паранены і некаторыя лёгка паранены.

У зьвязку з забастоўкаю арыштавана ўжо 300 рабочых.

Жонка Бэла Куна ня ўпушчана ў Аўстрыю.

ВЕНА, 13-VI. „Нэйе Дынэр Тагеблят" паведамляе, што аўстрыйскае пасольства ў Маскве, дзейнічаючы водлуг інструкцый кіраўніцтва аўстрыйскага канцлера, адмовіла ў выдачы візы на выезд у Аўстрыю жонцы Бэла Куна, якая хацела адведаць свайго мужа ў астрозе і прысутнічаць на працэсе.

Працэс шахцінскіх контр-рэвалюцыянэраў.

(22-гі дзень працэсу).

Шкодніцтва на Мушкетаўскім і Багадухаўскім руднікох.

Паказаньні інжынэра Сокалава.

МАСКВА, 13-6. Раніцяе пасяджэньне шахцінскага працэсу 13-га чэрвеня пачынаецца з допыту падсуднага інжынэра Сокалава. Сокалаў прызнае сябе вінаватым як у шкодніцкай дзейнасьці, так і ў прыналежнасьці да шкодніцкае арганізацыі.

Паказаньні падсуднага Сокалава асьвятляюць перад судом першыя моманты заснаваньня шкодніцкае арганізацыі. У 1922 г. Сокалаў пазнаёміўся з інжынэрам Андрэявым, галоўным інжынэрам Мушкетаўскага куста. Сокалаў даведаўся, што Андрэяў падтрымлівае сувязь з ранейшымі ўласьнікамі капальняў заграніцаю і атрымлівае ад іх грошы. З тае прычыны, што ў Сокалава ў той момант «было вельмі кепскае матар'яльнае становішча», ён скарыстаў дапамогу Андрэева і атрымаў ад яго 500 тысяч руб. у грашовых знаках таго часу. У 1923 годзе Сокалаў атрымаў інструкцыі ад Дваржанчыка і канверт, у якім было 200 чырвоных руб. Ліст перадаў падсуднаму інжынэр Матаў. У 1925 годзе падсудны Сокалаў траціў у Кадзіеўку, дзе яму прышлося праводзіць шмат буйных работ, між іншым, адніаўленьне коксавых печаў. Тады-ж Сокалаў прыняў да сябе інжынэра Бяарынава і інжынэра Нікрасава, як галоўнага мэханіка. Карыстаючыся ранейшым знаёмствам. Сокалаў паведаміў Бяарынаву аб сваіх намерах.

У 1925 годзе інжынэр Матаў прывёз у Кадзіеўку і выдаў першы раз падсуднаму каля 1000 руб. Тады падсудны сказаў Матаву ўпачатку аб інжынэры Бяарынаве, потым у 1926 годзе падзяліўся гранымы з Нікрасавым.

1-га верасьня 1927 г. Сокалаў быў наведзен у кіраўніцтва будаўніцтвам Донвугалю. Тут быў назначан у пад'аддзел агульнага праэктаваньня. Задачаю яго была прапрацоўка тэарэтычных частак праэктаў.

Сваю ролю ў кіраўніцтве новага будаўніцтва падсудны характарызуе як суцэльную блытаніну і няўмэнку. У сваіх паказаньнях падсудны Сокалаў гаворыць, што цьвёрда ведаў, што членамі шкодніцкае арганізацыі зьяўляюцца Матаў, Нікрасаў і Бяарынаў. Апрача таго, ведаў аб удзеле ў арганізацыі Братаноўскага, Бахтыярава і Сушчэўскага.

Калі допыт падсуднага пераходзіць да дзяржаўнага абвініцеля т. Крыленкі, дык апошняму ўдаецца выявіць шэраг важных храналёгічных моментаў заснаваньня і разьвіцьця шкодніцкае арганізацыі, а таксама і ўдзел у гэтай арганізацыі шэрагу асоб. У пэрыяд 1921 і 1922 году шкодніцкая арганізацыя яшчэ не стварылася. Тады на пэрыферыі заставаліся т. зв. «ініцыятыўныя шкодніцкія групоўкі". Гэтыя ініцыятыўныя групы працавалі асобна адна ад другое, ізалявана, кожная за свой страх і абапіраючыся на старую індывідуальную сувязь з гаспадарамі.

Водлуг паказаньняў абвінавачанага Сокалава ўстанаўляецца, што ён уваходзіў у адну з такіх групоўак, дзе былі Імянітаў, Дэтэр, Кузьма, Нікрасаў, Братаноўскі і Фрыдман.

Падрахоўваючы вынікі допыту падсуднага, т. Крыленка сьцьвярджае, што, пачынаючы з 1922 г., падсудны быў асьведамлен аб існаваньні сувязі з заграничнай арганізацыяй прамысловцаў. У 1924 годзе падсудны вядзе актыўную працу ў пад'аддзел члена арганізацыі і ўмацаваньня арганізацыйнае сувязі на лініі шкодніцкае працы, у прыватнасьці на Кадзіеўцы ў галіне будаўніцтва капальняў. Устанаўляецца асьведамленасьць падсуднага Сокалава наконт ужываньня захадаў, каб прыпыніць працу капальні ў выпадку магчымае інтэрвэнцыі.

Сьвядомы сабатажнік.

Судовая прысутнасьць пачынае допыт падсуднага інжынэра Бяарынава, які працаваў апошні час на Несьвятаўскім руднику. Бяарынаў прызнае сябе вінаватым толькі часткова ва ўдзеле ў шкодніцкай арганізацыі. Праца яго пачалася ў 1924 годзе, калі ён атрымаў з заграніцы ліст ад Дваржанчыка, перададзены яму Адровым. У гэтым лісьце прапанавалася Бяарынаву прыпыніць адначку затопленых гарызонтаў на Калінінскай капальні адцягваючы увагу на распрацоўку новага пласту, пачатага ў 1923 годзе. Чулкоўская капальня, Байрак, Кадзіеўка, ізноў Байрак, потым Несьвятай—праз усе гэтыя капальні прайшоў Бяарынаў, і ўсе яны адзначаны яго шкодніцкаю дзейнасьцю: у Байраку затоплены гарызонты, у Кадзіеўцы сьвядомы сабатаж у праэктаваньні капальні Ільліча, на Несьвятаі—выдумка праэкту падвойнае адобычы, які павінен быў адкласьці эксплёатацыю дзейнічаючых капальняў. Потым шэраг дробязяй.

Пераходзячы да пытаньня аб інжынэрах, з якімі ён сустракаўся ў сваёй шкодніцкай працы, Бяарынаў называе Быхоўскага, Шадлуна, Аўчарыка, Будзнага, Сушчэўскага. Сушчэўскага—гаворыць падсудны—я лічыў сваім духоўным айцом.

З запытаньняў Крыленкі выяўляецца, што Бяарынаў атрымаў ад Дваржанчыка тры лісты. У двох былі шкодніцкія дырэктывы і грошы. У трэцім Дваржанчык даваў дырэктывы на выпадак вайны. Гэтыя дырэктывы прадугледжвалі пашкоджаньне водаадліву і вэнтыляцыйных установак. За выкананьне дырэктыў у выпадку ўдачы абяцана была ўзнагарода ў 1000 даляраў.

Бяарынаў перадае ў гутарцы з Матавым у лютым 1926 г. аб «спэцыяльных функцыях», якія ён павінен быў узяць на сабе незалежна ад сваіх «абавязкаў» па «капальні». Гэтыя функцыі датычыліся перадачы заграніцу сістэматычных пэўных востак. З грамадзянінам, якога Бяарынаў называе Казімір і праз якога гэтыя весткі перадаваліся, ён падтрымліваў зносіны ў працягу самі месяцаў. Спатканьні іх мелі сурова канспірацыйны характар, і кожны раз Бяарынаў перадаваў яму пакеты, якія шлі ад Матава.

Больш падрабязныя паказаньні знаёмства з Казімірам Бяарынаў дасьць пазьней на зачыненым пасяджэньні суду.

На гэтым канчаецца раніцяе пася

Нямецкі друк аб справе „Грамады"

(«Der rote Helfer» № 4).

Нянавісьць і пагарда катам працоўных.

«Няма ўкраінцаў, беларусоў і літоўцаў—ёсьць толькі палякі».—Гэта лозунг польскага фашызму.

За гады польскага панаваньня на Заходняй Украіне зачынена 2.160 украінскіх школ, а на Беларусі—ўсе 514 школ, якія там існавалі.

Паліцайскі апарат на Беларусі і Украіне ўсё павялічаецца. Ужо ў 1923 годзе было па афіцыйных лічбах на Беларусі і Украіне 26.000 паліцэйскіх, ня лічачы агентаў таемнай паліцыі. Тэрор і ўціск нацыянальных меншасьцяў узбудзілі ў працоўных Заходняй Беларусі жаданьне аснаваць самастойную арганізацыю для абароны сваіх інтарэсаў.

Гэтак узьнікла на Беларусі ў 1925 годзе пад кіраўніцтвам беларускіх дэпутатаў сойму Тарашкевіча, Рак-Міхайлоўскага, Валошына і Мятлы сялянска-работніцкая арганізацыя «Грамады», праз якую беларускае працоўнае насельніцтва атрымала на нядоўгі час магчымасьць пачаць барацьбу за нацыянальнае і культурнае вызваленьне.

«Грамада» ўзьнікла пасьля расколу беларускага дэпутацкага клюбу ў сойме: на адным баку стаяла фракцыя дэпутатаў Рагулі, Яроміча і Станкевіча, якія прадстаўлялі інтарэсы жменькі беларускіх інтэлігентаў і кулацтва, а на другім баку—фракцыя з Тарашкевічам, Мятлой, Валошыным і Рак-Міхайлоўскім на чале, якая ставіла сваёй задачай — абарону інтарэсаў прыгнечанай большасьці беларускага насельніцтва.

Барацьба проці нацыянальнага ўціску, за права самавызначэньня беларускага народу, за дармовую выдачу зямлі, за супольнае змаганьне працоўных Беларусі і працоўных усёй Польшчы,—вось задачы якія ставіла сабе «Грамада».

«Грамада» ўзьнікла як легальная партыя. Пры аснаваньні ў ліпені 1925-га году налічвала „Грамада" 569 чалавек сяброў. Нясутрымна расла яна далей. Год пасьля абыймала яна ўжо 3 144 сябры, а 15-га студзеня 1927-га году «Грамада» мела ў сваіх радох больш чымся сто тысяч сяброў. Яна трымала сьцяг у барацьбе проці мясьцяніна нацыянальнага ярма польскіх капіталістых і буйных паноў у Заходняй Беларусі і выконвала сваю працу пры нязвычайнай спагадзе ўсяго працоўнага насельніцтва. У сойме калі дэпутаты «Грамады» сваю барацьбу. У тузінах інтэрпаляцый раскрывалі яны фашыцкія мэтады кіраваньня і шалёную эксплёатацыю, якой падлягае працоўнае насельніцтва ад польскага ўраду. **«Грамада», дзякуючы свайму бязбоязнаму змаганьню, стала для працоўных сымбалем іх вызваленьня.**

Кілсудзкі і яго ўрад цярпелі спачатку «Грамаду». Але калі яна стала нападаўна і хутка мацнець, падняцца нячуваная рэакцыйная кампанія ў друку—брахня і правакацыя былі апрабаваныя мэтады, мясцовыя ўстановы ўсё больш і больш скарачалі і люта ўціскалі дзейнасьць „Грамады". Пачалася хваля дамовых пэратрусак і арыштаў і крывавага тэрору.

3-га сьнежня 1926-га году пасьледняў вядомы пагром з крываваю бойкай у Старай Бярозе, які інсцэніравала проці легальнага кангрэсу «Грамады» польская паліцыя ў поўнай форме. Нават і дэпутаты сойму атрымалі тут крывавыя раны. Яшчэ да таго, як сойм настанавіў выдаць іх, пасьледваў незаконны арышт беларускіх дэпутатаў на тэй падставе, быццам, яны былі захоплены на месьце злачынства. У сапраўднасьці аднак Тарашкевіча і Валошына захапілі ў ложках, Рак Міхайлоўскага заарыштавалі на вакзале, а Мятлу на роднай вёсцы. У Тарашкевіча знайшлі некалькі тузін злотых. Фашыцкая прэса зрабіла з іх 15000 даляраў. У гэткім стылі вялася кампанія проці «Грамады».

Працэс проці «Грамады» ў Вільні ёсьць частковы працэс проці беларускай работніцка - сялянскай партыі «Грамады». **400 найлепшых грамадзян беларускага народу трэба абвясьлавіць у вачох працоўнага народу шляхам гэткіх працэсаў.** Польская дзяржаўная пракуратура пабудавала ўсё абвінавачаньне на відавочна правакацыйных зацьверджаньнях. «Грамада», быццам, дзейнічала ў інтарэсах (на карысьць) адной чужаземнай дзяржавы, а правадыры яе атрымлівалі быццам паказаньні ад «маскоўскіх агентаў». На гэтай падставе можна апраўдаць гаданы люты прысуд да катаржнага вастрогу. Каб адцягнуць увагу замежных краін ад гэтага нячуванага працэсу проці беларускай партыі народу, увесь працэс падзелен на чатыры паасобныя працэсы, якія адбудуцца ў розных ваяводзтвах (паветах).

Пачаты 23 лютага 1928 г. у Віленскім судзе вялікі працэс быў накіраваны проці 56 правадыроў беларускай «Грамады», выкліканы 421 сьведку і 8 экспэртаў. Абвінавачальны акт абыймаў 85 вялікіх на машынцы надрукаваных старонак, да яго даданы 36 тамоў з дакумантамі. Абвінавачаньне, якое ўзбуджана проці беларускай «Грамады», меркавала **працяглую дзяржаўную здраду і сувязь з аднэй замежнай дзяржавай.** Мэтай іх быццам было адлучыць, шляхам узброенага паўстаньня, беларускія землі ад Польшчы і аддаць іх пад уладу Савецкага Саюзу. На гэта яны быццам былі і падбуплены. Сацыялістычны дэпутат, праваназнаўца Лібэрман, заявіў, што падстава абвінавальнага акту вельмі слабая.

Допыты сьведкаў, сьведкаў абвінавачаньня ясна давялі, што ў аснову гэтага працэсу лягчі доказы і правакацыя. Сьведкі абароны, якія выступілі пасьля адтэрмінаваньня працэсу з-за парляманцкіх выбараў, былі заарыштаваны ў зале суда з прычыны «належнасьці да забаронэнай партыі «Грамады». Гэта зрабілі відавочна з мэтай—застрашыць другіх сьведкаў абароны і адбіць у іх ахвоту даваць праўдзівыя паказаньні на карысьць абвінавачаных. У гэтым працэсе цьвёрда і напэўна вызначана, што польская дэфэнзыва, каб скласьці абвінавальныя матар'ялы, працавала разам з шпегамі.

Так, напрыклад, у залі суда ўдалося зьняць маску з сьведкі, які доўгі час быў сябром «Грамады» і адначасна працаваў, як шпег у паліцыі.

Гэты працэс, які адбыўся ў Вільні, павінен зацікавіць працоўных усіх краін і ня толькі працоўных, але ўсіх, хто мысьліць праўдзіва і чалавечна. Усе тыя, хто да гэтай пары лічылі амаль што немажлівым ужываць гэткія мэтады барацьбы проці партыі працоўнага народу, могуць у гэтым працэсе ўбачыць сапраўдны твар фашызму Пілсудзкага.

Нанавісьць і пагарда катам працоўных Польшчы.

Вось, якім павінен быць вынік ужо першага працэсу «Грамады».

НАДЗВЫЧАЙНЫЯ ПЕРАВЫБАРЫ САВЕТАЎ У СМАЛЕНШЧЫНЕ.

СМАЛЕНСК, 13-VI. Перавыбары саветаў у Смаленскім павеце адбываюцца пры выключнай актыўнасьці выборчыкаў. Водлуг водгукаў выбарчае кампаніі, такое актыўнасьці ніколі ня было. Процант удзелу ў некаторых мясцох дасягае сотні. Саветы амаль цалком аднаўляюцца за кошт беднаты і серадняковаў.

Кулакі, якія трацяць уплыў, розными сродкамі прыпыняюць і перашкаджаюць працы. У Грынеўскай волясьці ноччу быў украдзен сьпіс пазбаўленых правоў і на яго месцы быў вывешан другі сьпіс, у якім значыліся нібы пазбаўленыя правоў беднякі. Зарэгістравана шмат выпадкаў скліку кулакамі нацыональных сходаў.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Вясковы актыў змагаецца з кулацтвам.

Вучотная кампанія распачалася па сельсаветах з 1 чэрвеня. У двух сельсаветах Запольскім і Дварэцкім вучот ужо скончан. У Запольскім с.-с., дзякуючы актыву вёскі, як настаўніка, камсамольцаў і г. д., выкрыта 300 дзес. утоенай зямлі. За гэта кулакі спалілі школьны хлеў, у якім была карова настаўніка. Гэты прыклад сьведчыць аб тым, што кулаччо ідзе на ўсякія злачынствы, каб запужаць вясковы актыў. У Дварэцкім сельсавеце таксама выяўлена шмат утоенай зямлі. Калі летась у аднаго кулака было 18 дзес., то сёлета стала 28 дзес., што ўдалося выявіць, дзякуючы прыцягненьню да гэтай справы каморнікаў, лясьнічых і г. д. На практычным правядзеньні вучоту ў гэтых сельсаветах выявіўся цэлы шэраг недахопаў: новы закон слаба папулярызован сельсаветамі сярод насельніцтва, у правядзеньні вучоту няма плянавасьці, што затрымлівае працу праверачных камісій. Некаторыя ўстановы яшчэ не далі с.-с. вестак аб пабочных заробках. Беднату да вучоту не падрыхтавалі, самі працаўнікі с.-с. скрываюць аб'екты ападаткаваньня, так, член с.-с. Арцёмаў Павал з в. М.-Крушынаўка схаваў ад вучоту 4 сьвіньні і 2 авечкі.

У тых сельсаветах, дзе вучот праведзен, прыкмячаецца павялічэньне аб'ектаў ападаткаваньня наогул, так сьвіней у вёсцы М.-Крушынаўцы павялічылася ў два разы, кароў на 10 проц. Бедната баіцца адкрыта выяўляць у заможных захаваныя аб'екты, але значны ўдзел прымае і дапамагае праверачным камісіям, якія актыўна выяўляюць схованыя аб'екты. Наогул, вучот ідзе здавальняюча.

Я. Крушына.

Рагачоўскі р., Бабруйшчына.

Ш.С.М. падрыхтавала 25 культурных гаспадароў.

Ворша, 14-6. У маі месяцы Барысьценаўская школа сялянскай моладзі адсьвяткавала выпуск з апошняй клясы вучняў. Усяго выпушчана 25 чалавек новых кваліфікаваных гаспадароў-культурнікаў. З гэтага ліку выпушчаных вучняў маецца 7 дзяўчын.

Кожны вучань гаспадарку свайго бацькі перавёў на шматпольле. Апрача гэтага, вучні шчыра працавалі і над пераводам на шматпольле гаспадарак суседніх вёсак. Усяго пераведзена на шматпольле 21 сялянская гаспадарка і 1 калектыўная. Настаўнікі правялі агляд гаспадарак бацькоў вучняў. Вынікі паказалі, што бацькі каапераваны на 50 проц. па лініі сельгаскаап., харчуюць жывёлу па норме, перабудавалі і ўцяплілі хлявы на 60 проц., а таксама шмат чаго зрабілі па паляпшэньню гаспадаркі.

Прахор Аўчыньнікаў адмовіўся ад папоўскага сану.

Ворша, 14-VI. Поп Прахор Аўчыньнікаў, з вёскі Чырвоная-Слабада, Савінскага с-с., Дубровенскага райёну, на агульным сходзе сялян, на якім усебакова абгаварвалася пытаньне аб новым падатковым законе, заявіў, што адмаўляецца ад сану і ў далейшым у царкву наступіць і нагой.

Аўчыньнікаў даў свой подпіс старшыні с-с., што службы ў царкве ня будзе праводзіць і што парывае сувязь з апошняй.

Гаспадарка без пасеву жыта.

Магілеў, 14-VI. Гаспадарка грам. Пісарава ў вёсцы Гарадцы, Чавускага райёну, якая мае на 9 душ 3 гэктары зямлі, зусім ня сее зернавых культур. Уся зямля ляжыць сабою гарод. Сваю прадукцыю, пераважна капусту, прадае сялянам (горад—далёка). Гр. Пісараў жыве нябедна. На сельскагаспадарчай выстаўцы атрымаў прэмію за карняплоды і капусту.

КРЭДЫТЫ ДЛЯ ЎЗМАЦНЕНЬНЯ КАЛГАСАЎ.

Магілёў, 14-VI. Акруговае сельскагаспадарчае крэдытнае таварыства атрымала гэтымі днямі з Белсельбанку 20.000 руб. на крэдытаваньне калгасаў акругі. Гэтыя сродкі вызначаны для пашырэньня агнітрывалага будаўніцтва і індустрыялізацыі калгасаў.

Мазыр, 14-VI. На ўзмацненьне гаспадарчага становішча калектыўных гаспадарак Мазыршчыны дадаткова адпушчана 6000 руб. доўгатэрміновага і 5000 руб. кароткатэрміновага крэдыту. Грошы ўжо разьмеркаваны.

„УЛАСНАЯ КІШЭНЯ ДАРАЖЭЙ ЗА ДЗЯРЖАЎНУЮ ЭКАНОМІЮ".

Гомель. У мэтах зьнішчэньня раўналежнасьці ў двух аднолькавых установах, скарачэньня немотазгодных выдаткаў, гарсавет яшчэ ў лютым ухваліў пастанову аб пераводзе мікрастанцыі, якая знаходзіцца ў Гомелі, на бойню.

Гэтае мерапрыёмства тлумачыцца тым, што памяшканьне мікрастанцыі ў Гомелі, па сваёй неадпаведнасьці, спрыяе разьвіцьцю трыхінозу, а на бойні маецца добра абсталяванае памяшканьне.

Здавалася-б, што кіраўнікі вэтэрынарна-санітарнага нагляду, маючы эканомію каля 500 руб. у месяц, лепшае памяшканьне і г. д., павінны былі зараз-жа выканаць пастанову гарсавету. Між тым вэтэрынарны аддзел марудзіць.

Справа ў тым, што дзяржаўная эканомія не зьяўляецца карыснай для ўласных кішэняў вэтэрынарных працаўнікоў. Пры існаваньні двух установаў вэтэрынарныя ўрачы маюць магчымасьць сумяшчаць. Напрыклад: вэтэрынарны ўрач Пухаў, які працуе ў АКРЗА на пасадзе эпізоотычнага ўрача з акладам у 100 руб., і адначасова сумяшчае пасаду ўрача на станцыі барацьбе з шаленствам. Вэтэрынарны ўрач Кутэпаў, працуючы на чыгуначным вэтэрынарным пункце з акладам у 110 руб., мае магчымасьць атрымліваць на бойні яшчэ 105 руб. у месяц. Сам акруговы ўрач Барцэвіч, які атрымлівае 175 р., сумяшчае пасаду вэтэрынарнага ўрача конскага заводу за дадатковую плату ў 50 руб. штомесячна пры дарэмнай кватэры з рознымі выгодамі.

Ад гэткага сумяшчэньня гарадзкі мясцовы бюджэт кожны месяц траціць лішніх каля 700 руб. на розныя ўстановы, якім вэтурачы аддаюць 1-2 гадзіны ў дзень. Сумяшчэньне адбіваецца і на райвэтвучастках. Вэтэрынарныя ўрачы адмаўляюцца працаваць у райёнах, бо ўсе імкнуцца ў горад, дзе можна лепш зарабіць.

Адміністрацыя вэтэрынарнага аддзелу дружна жыве з супрацоўнікамі. Яшчэ ў сакавіку г. г. была ўхвалена пастанова аб зьняцьці з працы касіра-рахункавода Азарава, як неадпавядаючага свайму прызначэньню, але ён усё яшчэ працуе, спадзяючыся на рэарганізацыю, каб можна было атрымаць ліквідацыйныя, як зволенаму па рацыяналізацыі.

Пабудова дрэваапрацоўчага камбінату.

Гомель, 14-VI. Лесбелам распрацован новы праэкт рэарганізацыі дрэваапрацоўчай прамысловасьці ў акрузе. Намячаецца арганізаваць у Новабеліцы дрэваапрацоўчы камбінат. Пры лесазаводзе „Колтруд" у гэтым годзе будзе пабудован абозна-коляны завод, на якім будзе занята каля 500 рабочых. Апроч таго, маркуецца разгарнуць паркетна-калодачную вытворчасьць, пабудаваць сушылку для дошчак з прапускной здольнасьцю каля мілёну куб. футаў у год. Пабудова сушылкі дасьць магчымасьць будаўнічым арганізацыям атрымаць сухі будаўнічы матар'ял.

Уклады ў касу ашчаднасьці павялічыліся на 14 тысяч.

Горкі, 14-VI. З 1-га па 15 мая ў Горацкай касе ашчаднасьці завербавана 60 чалавек новых укладчыкаў на суму ўкладаў агулам у 3720 р. 19 к.

Старыя ўкладчыкі, у колькасьці 130 асоб, зрабілі дадатковыя ўклады на 10.776 руб. 87 кап.

У гэтай працы лістаносцы вічога не зрабілі.

СТРАХАВАНЬЕ БАТРАКОЎ.

Мазыр, 14-6. Па акрузе прыступлена да страхаваньня батракоў і пастухоў.

У некаторых райёнах ужо застрахована батракоў і пастухоў па абавязковым і дабраахвотным страхаваньні звыш 100 чал.

Камсамольцы арганізавалі пажарную дружыну.

Багушэўскае, 14-VI. У Багушэўскім райёне ў м. Багушэўску (над непасрэдным кіраўніцтвам месцачковай і сельсавецкай ячэек КСМ арганізавана дабраахвотная пажарная каманда з 65 камсамольцаў. Усе камсамольцы, як адзін, далі слова—камсамольца ўпарта і шчыра абараняць народную маемасьць ад пажару.

НА РУІНАХ ПАНСКАГА ДВАРА ВЫРАСЛА ПРАЦОЎНАЯ АРЦЕЛЬ.

Яшчэ ў 1926 годзе на былой абшарніцкай зямлі пана Вінслановіча замест сельска-гаспадарчага земляробчага таварыства «Прагрэс», якое прывяло гаспадарку да згубы, была арганізавана працоўная земляробчая арцель «Вэкер», у склад якой увайшло 9 сем'яў, з якіх 8 яўрэйскіх. Спачатку свайго існаваньня арцель мела ўсёй зямлі 144 дзесяціны, з якой саду 11 дз., сядзібы 5 дз., пашні 37 дз., сенажаці пры арцелі 17 з палов. дз., і на адлегласьці 12 кілёмэтраў 56 дз., і інш. 17 з палов. дз. Спачатку склад арцелі быў вельмі кепскі, палова членаў—была спэкулянты, арцель працаваць не хацела, а наймала падзённых рабочых, якім плаціла за 12 гадзін працы 50-60 кап., зямлю абраблялі дзедаўскім спосабам. Арцель была ачышчана ад непрацоўнага элемэнту, а замест іх туды былі ўведзены сапраўдныя беднякі.

Цяпер арцель мае 18 кароў, 9 коняй і маладняка 5 шт., гаспадарка вядзецца культурным спосабам, поле засяваецца толькі гатункавым збожжам і большай часткай бульбай, якой цяпер было здадзена Бацуньскаму с.-г. таварыству 1500 пуд. Жывёлагадоўля пастаўлена добра, ёсьць кармушкі, цёплыя хлявы, цяпер арцель пабудавала новы цёплы хлеў па правільнаму прыкладному пляну. У часе вясеньняй сяўбы арцель заклала вопытна-паказальныя вучасткі з ужываньнем штучнага ўгнаеньня, засеяла 3 дзес. лубінам.

Але побач з гэтым у працы арцелі ёсьць недахопы: слаба вядзецца культасьветная праца. Вясною, калі ў сялянства няма сена, дык арцель за сена з яго дзярэ скуру, прадаючы пуд сена па рублю і больш. Арцель мае 2 племянныя быкі, якімі беднота, згодна пастановы арцелі, павінна карыстацца дармова, але член праўленьня адпускае іх тым сялянам, якія прыносяць праўленьню масла, ці яек дзесятак. Вядома, што ў бедняка гэтага няма і быкамі карыстуюцца заможныя. На гэта трэба каму належа зьвярнуць увагу.

Дзяніс Духвалаў.

Уваравіцкі р., Гомельшчына.

Вёска на шляху калектывізацыі.

Калгас „Расьсьвет".

Цяжкая спадчына дасталася калгасу «Расьсьвет». Ад раней існаваўшай разбуранай, недысцыплінаванай сельска-гаспадарчай арцелі «Колас» дасталося «Расьсьвету» разьбітае карыта. Пачынаць нанава прышлося расьсьветаўцам будаваць гаспадарку, але на шляху гэтага будаўніцтва сустрэліся цяжкія перашкоды.

У першы-ж час працы калгасу ворагі калектыўнага жыцьця падпалам гумна, набітага збожжам, пакінулі сяброў калгасу амаль што зусім бяз хлеба. Праз некаторы час запалаў агнём і скотны двор калгасу.

Рукі апушчаліся ад такой злоснай помсты ворагаў калгасу і толькі дружная спайка сяброў і вера ў свае сілы прымусіла сяброў калгасу цясьней згуртавацца ў адно, ачысьціць свае шэрагі ад непатрэбнага элемэнту. Гэта было практычнай мераю ў справе захаваньня калгасу. З таго часу (1924 году) у калгасе „Расьсьвет" працуе 18 сямей.

Нясьмела і памаленьку пачыналі сваю працу калектывісты. Маючы невялікую колькасьць сродкаў і інвэнтару, шмат гора прышлося працаўрпець будаўнікам калектыву. Але цяпер мукі ўжо забыты. „Расьсьвет" стаў запраўдным расьсьветам калектыўнага жыцьця. Калгасам устаноўлен 9 польны севазварот, маецца сталёвы конь-трактар, які замяняе калгасу амаль што ўсю рабочую жывёлу.

Цяпер у калгасе 56 дойных палепшанай народы кароў, а ў час арганізацыі калгасу, сябры калгасу сьцягнулі ў купу 28 сухарэбрых кароў.

Чым жа новым, культурным можа пахваліцца калгас «Расьсьвет»: папершае—палепшаньнем пароды жывёлы, развядзеньнем добраякаснага насеньня, шырокай дасьледчай працай па сельскай гаспадарцы, правільным даглядам за жывёлаю, добрай таварыскай дысцыплінай і г. д.

Калгас трымае самую цесную сувязь з бліжэйшай Турскай сельска-гаспадарчай станцыяй. Яе культурныя выпрабаваньні пераносяцца ў калгас, па яе ініцыятыве ў гэтым годзе калгас заклаў 32 розныя сельска-гаспадарчя вопыты.

Крыху аб дысцыпліне. Дысцыпліна тут галоўны фактар працы. Яна рушыць уперад усё. Праца кіпіць пад рукамі сяброў калектыву. Ніколі ня чуваць тут слова вынявагі і скаргі. Тут нават уведзен васьмігадзінны працоўны дзень, чаго вы ня знойдзеце амаль што ні ў адным калгасе. Правядзеньню яго шырока дапамагае пастаўленая добра машынізацыя гаспадаркі.

Дзякуючы добра і ўмела пастаўленай працы калгас за апошні год меў больш 5 тысяч рублёў чыстага прыбытку. На частку гэтых грошай ён закупіў вялізарную малатарню, а на астатнія грошы будуе масларобна-сыраварны завод і яшчэ больш наладжвае свой дабрабыт.

Сялянства часта заходзіць у калгас паглядзець на калектыўнае жыцьцё, параіцца аб лепшым вядзеньні гаспадаркі. Калгас за апошні год выдаў вакольнаму сялянству 200 пудоў заваднога жыта, штодзённа сялянства карыстаецца калгаскімі вытворнікамі.

Калгас мае саматужную крухмальну і сумесна з суседнім калектывам—масларобны завод. У хуткім часе ён распачынае пабудову крахмальнага заводу, які будзе па свайму абсталяваньню і велічыні першым на Бабруйшчыне.

Глядзіш на жыцьцё ў калгасе і дзівішся таму аднадушнаму імкненьню ўсіх сяброў колектыву як мага ўзмацняць калектыў. А. Дамброўскі.

Жлобінскі р., Бабруйшчына.

Беднату выратавала арцель.

Да Кастрычнікавай рэвалюцыі вёска Аляксандраўка, Радамскага сельсавету была пад уціскам мясцовага пана Чахоўскага. Палацы ён набудаваў аж у сялянскіх агародах. Штодня плакалі аляксандраўцы горкімі сьлязамі ад пана. Як толькі прайшлі чуткі пасьля Кастрычніка, што сяляне забіваюць паноў, Чахоўскага як бы і ня было. Пачалі тады заможнікі расьцягваць панскае дабро, а беднота глядзела на гэта ды дрыжэла ад страху, бо яна больш, як хто, была запалохана панамі. Аднак, гледзячы на заможнікаў, і яна, урэшце, узялася за панскую зямлю.

У 1924 г. лепшай зямлёй, садам і былымі панскімі палацамі заўладала Радамскае сельска-гаспадарчае таварыства.

Аляксандраўская беднота пачала гаварыць, каб арганізаваць калектыўную гаспадарку. Камсамольцы т.т. Лурыкаў і Шпакоў ужо даўно агітавалі за гэтую справу і ў выніку 9 гаспадароў-беднякоў увосень мінулага году падалі заяву ў Чавускі РВК. Доўга РВК цягнуў гэту справу. Ён знаходзіў розныя прычэпкі: то каб зямлі калектыў адвёў і каб школу зрабіў у былым панскім будынку. На ўсё гэта згадзілася беднота, адпусьціла пад школу будынак і кавалак зямлі ў 1/2 дзесяціны. Можа-б Чавускі РВК і яшчэ што знайшоў, каб затрымліваць арганізацыю калгасу, але тут дапамагла «Крестьянская газета» і НКЗ Бел., куды беднота зьвярнулася са скаргай.

З вялікай радасьцю аляксандраўская беднота падпісвала статут калгасу ў сакавіку месяцы г. г. і абрала праўленьне.

Ужо распачалі калектыўна абрабляць зямлю, пасялі ячмень ды авёс.

Набылі праз Радамскае с.-г. таварыства сельска-гаспадарчыя машыны і штучныя ўгнаеньні. Глядзяць на ўсё гэта заможнікі ды зайдзросьцяць, а беднота не парадуецца новым жыцьцём.

Ч. В.

Чавускі райён, Аршаншчына.

ВЫТВОРЧЫЯ ПЛЯНЫ КАЛГАСЫ ВЫКАНАЛІ.

Магілеў, 14-VI. Тая ўвага, якая зварачваецца ў апошні час калгасам, ужо дала свае вынікі.

У Клімавіцкім райёне тры таварыствы па супольнай апрацоўцы зямлі перайшлі на статут арцеляй, у Чавускім райёне такі пераход зрабілі два таварыствы, праведзена аграмаджаньне жывёлы ў 9 калгасах.

Пасяўная кампанія прайшла зусім добра: з аднаго боку калгасы былі забясьпечаны ўсім неабходным для пасеву, з другога боку—самі калгасы выканалі складзеныя для іх пляны.

Ніколі не абгаварвалі калгасьнікі так уважліва і разам з тым востра пытаньне аб падвых узносах, аб разьмеры адлічэньняў у асноўны, падзельныя і непадзельныя капіталы.

І пытаньне аб арганізацыі працы вырашана больш выразна і пэўна.

Калі летась яшчэ калгасы не хацелі прымаць спосаб разьмеркаваньня прадуктаў па патрэбнай працы, дык сёлета 3 з 4 калгасаў ажыцьцяўляюць гэты спосаб. Мала таго, дзе-ні-дзе вылучаецца фонд на ўтрыманьне непрацаздольных.

У двух райёнах калгасы на сваіх нарадах ухвалілі запрасіць аграномаў за свой кошт. У далейшым гэта уласнай калгаснай групавой аграманміі не абыйсьціся. А зараз становішча рэчаў (бурны рост новых калгасаў—у першую чаргу) патрабуе, каб на райёнах былі вылучаны аграномы выключна для працы ў калгасах.

Экспэдыцыі для вывучэньня прыродных багацьцяў Беларусі.

Беларускі Геолёгічны Інстытут сёлета будзе праводзіць сваю працу ў Магілеўскай акрузе ў водазборах рэчак Проні, Рэсты, Дняпра і Сожу; у гэтых мясцох будуць праведзены значныя свідравальныя работы; будуць праводзіцца дасьледы і ў Віцебшчыне.

Апрача таго, Інстытут па заданьні Полацкага акрвыканкому накіроўвае дасьледчыкаў у Полаччыну для высьвятленьня яе мінэральнае сыравіны, а па заданьні Магілеўскага акрвыканкому будуць праведзены дадатковыя дасьледы для складаньня праэкту сілікатнага заводу ў Клімавічах. Маркуецца таксама зрабіць дасьледы земнага аналу і сапрапэляў, для чаго накіроўваюцца дасьледчыкі ў Мазыршчыну і Аршаншчыну.

У БССР падрабязныя глебавыя здымкі дасюль рабіліся толькі ў чатырох акругах—Аршанскай, Менскай, б. Барысаўскай і Мазырскай. Здымкі рэшты акруг павінны быць зроблены ў сьпешным парадку, бо гэта выклікаецца патрэбамі народнай гаспадаркі.

У бягучым годзе глебавыя дасьледы ахопяць адну з самых буйных акруг Беларусі—Бабруйскую. У гэту акругу Інбелкульт накіроўвае экспэдыцыю пад кіраўніцтвам праф. Афанасьсева, вучонага глебаведа т. Рогава; у ёй прымуць удзел 6 спэцыялістаў-глебазнаўцаў. Экспэдыцыя выяжджае на працу каля 25 чэрвеня і прабудзе ўсё лета. Будуць зроблены здымкі ўсёй акругі і праз кожныя 3 кілёмэтры будзе брацца глебавая проба з спэцыяльна зробленых разрэзаў.

Геобатанічныя дасьледы будуць праведзены экспэдыцыяй Палянскай, пад кіраўніцтвам якой ужо зроблена 10 вёрстная геобатанічная карта БССР. Другая геобатанічная экспэдыцыя пад кіраўніцтвам батаніка т. Адамава мае правесьці дэтальную геобатанічную здымку ў аколіцах Менску. Абсьледаваньне ў гэтым райёне будзе зьвязана з ранейшымі дасьледамі тэрыторыі ў вадападзеле р.р. Талькі, Пціча і Прыпяці.

15 чэрвеня накіроўваецца ў Магілеўшчыну антраполёгічная экспэдыцыя, якая будзе весьці працу ў райёне паміж Прапойскам і ст. Быхавам.

З 1 чэрвеня ў Мазыршчыне і Гомельшчыне працуе зоолёгічная экспэдыцыя Інбелкульту.

1 ліпеня пад кіраўніцтвам прафэсара А. Смоліча накіроўваецца геаграфічная экспэдыцыя ў райён вадападзелу Дняпра і Дзьвіны. Мэта экспэдыцыі—вывучыць фізыка-геаграфічныя асаблівасьці і эканамічны характар гэтага райёну. Ня гледзячы на тое, што тут адбываецца буйнае будаўніцтва (Асінастрой), гэты райён яшчэ належна ня вывучаны. Геаграфічная экспэдыцыя сёлета праядзе асноўную геаграфічную рэкагнасцыроўку і вызначыць шэраг пытаньняў, якія будуць дэтальна вывучацца ў наступныя гады. Маршрут экспэдыцыі: Ворша—Дуброўня—Асінастрой—Бабінавічы—Лёзна — Высачаны-Багушэўскае—Сенно—Талочын.

У Аршанскай акрузе будзе праведзена экспэдыцыя для вывучэньня хатніх рамёстваў. Яна будзе працаваць пераважна ў паўднёвай частцы Аршаншчыны. Адна партыя ў складзе сэкратара камісіі т. Рака і т. Гарэліка і займецца вывучэньнем народнага ткацтва, а другая партыя будзе вывучаць ганчарства.

Апроч таго, сёлета пашырае сваю працу па дасьледаваньні краіны Навукова-Дасьледчы Інстытут імя Леніна. Будзе наладжана некалькі экспэдыцый для вывучэньня быдла, сьвіней, эфэктыўнасьці крэдытаваньня і капітальнага ўлажэньня ў гаспадарку. У Віцебшчыне ўжо працуе экспэдыцыя пад кіраўніцтвам спэцыяліста т. Бойка над вывучэньнем севазвароту.

Выключэньне камуністаў і прафбюракратыя.

(Ліст з Англіі).

З часу ўсеагульнай забастоўкі 1926 г. і сямімесячнай барацьбы гарнякоў, у якой лідэры рабочай партыі і прафсаюзаў адыгралі гэткую здраўніцкую ролю—асабліва ў адносіне міжнароднага адзінства прафсаюзаў,—кіраўнікі рабочай партыі і генсавету вядуць злосную кампанію помсты супроць камуністаў і актыўных левых прафпрацаўнікоў. У гэтай кампаніі так званыя «левыя» аб'ядналіся з правымі, каб прымусіць замаўчаць усіх крытыкуючых афіцыйную палітыку і чынасьць прафсаюзаў і рабочай партыі; тых-жа, хто адмаўляецца маўчаць, яны проста стараюцца выганяць з рабочага руху.

Бюракраты рабочай партыі ўжо выключылі з яе камуністаў і членаў левага крыла і нават цэлыя мясцовыя аддзелы рабочай партыі, якія адважыліся пярэчыць супроць выключэньня камуністаў. Зараз пад пагрозу пасьлена права прафпрацаўнікоў-камуністаў удзельнічаць у канфэрэнцыях рабочай партыі. Сэкратар руху меншасьці, Гары Паліт, які карыстаецца вялікай папулярнасьцю сярод большасьці членаў саюзу кацельшчыкаў і быў адным з прадстаўнікоў гэтага саюзу на некалькіх канфэрэнцыях рабочай партыі і кангрэсах трэд'юніёнаў, падпаў такому-ж праследаваньню бюракратаў, якія спужаліся росту яго ўплыву сярод рабочых.

У сакавіку г. г. выканком саюзу кацельшчыкаў пастанавіў, што „члены саюзу, пра якіх вядома, што яны камуністы", ня могуць быць абраны ў якасьці делегатаў на кангрэс трэд'юніёнаў і на канфэрэнцыі рабочай партыі. Супроць гэтага новага «закону» паўсталі т. т. Паліт і Фэргюсон, якіх падтрымалі іх аддзелы саюзу. У сучасны момант вынікі пратэсту яшчэ невядомы, але, як мабыць цікава будзе чытачу, Джог Хіл, генэральны сэкратар саюзу кацельшчыкаў, прасіў генсавет падтрымаць яго і ўзьняў на пасяджэньні генсавету пытаньне аб распаўсюджаньні пастановы выканкому кацельшчыкаў на ўсе ангельскія прафсаюзы. Яго падтрымаў сацыял-дэмакрат Торн, сэкратар саюзу рабочых газавых заводаў. Супроць гэтай меры выступіў хітры Джым Томас. Ён заявіў, што гэткая пастанова дала-б у рукі камуністаў і руху меншасьці новую зброю супроць генсавету. Замест гэтага ён прапанаваў, каб кожны член савету пастараўся бяз шуму правесьці ў сваім саюзе пастанову аб пазбаўленьні камуністаў права быць абранымі на кангрэсы і канфэрэнцыі. Гэтай палітыкі зараз і прытрымліваюцца.

Зараз у становішчы адбыліся новыя зьмены, на гэты раз ужо ў саюзе гарнякоў. У выніку посьпехаў на прафсаюзных выбарах у двух шатляндзкіх акругах—Лянкашыры і Файфшыры—камуністы апынуліся на кіруючых пасадах у гарняцкіх саюзах гэтых акругаў. Але ранейшыя лідэры адмовіліся прызнаць абраных рабочымі на іх пасады камуністаў. Яны адмаўляюцца таксама склікаць нацыянальную канфэрэнцыю гарнякоў, на якой павінны быць паведамлены вынікі выбараў і пасьля якой яны павінны аддаць свае пасады новым абраньнікам.

На пасяджэньні выканкому ўсеангельскае фэдэрацыі гарнякоў 16-17 мая прысутнічала дэлегацыя з 7 раней-шых выбарных асоб гэтых акругаў (чатыры з іх—члены парляманту). Яны скардзіліся на тое, што камуністы на іх «нападаюць». Яны паведамілі, што калі-б, як гэтага вымагае статут, яны склікані канфэрэнцыю, дык ім прошлося-б пакінуць пасады і аддаць іх камуністам, атрымаўшы 28.600 галасоў, супроць 22.000 галасоў, атрыманых імі. Таму яны ня склікалі канфэрэнцыі. Яны спрабавалі апраўдаць сваю дзейнасьць фінансавымі меркаваньнямі, а іменна тым, што акруговыя саюзы Лянкашыру і Файфшыру ў даўгу ў нацыянальнага саюзу. Але яны прымушаны былі прызнаць, што доўг гэты існуе яшчэ з 1922 г., калі сэкратаром саюзу быў той-жа член парляманту Адамсон, які і зараз зьяўляецца сэкратаром, і Адамсон прымушан быў заявіць, што а ніводнага разу з 1921 году наяўнасьць гэтага доўгу ня была повадам для пазбаўленьня акруговых саюзаў выбарчага права.

Выканком фэдэрацыі гарнякоў 15 галасамі проці 7 ухваліў рэзалюцыю, асуджаючую камуністаў. Большасьць выканкому ўбачыла ў лёсе лянкашырскіх і файфшырскіх бюракратаў свой уласны будучы лёс. Гэтую

Роля спэцыялістых у пабудове народнае гаспадаркі.

(З прамовы тав. Галадзеда на Усебеларускім зьезьдзе інжынэрау-тэхнікау 18 мая 1928 г.)

Таварышы! Мы закончылі адзін з пэрыядаў сацыялістычнага разьвіцьця —пэрыяд адбудовы нашай гаспадаркі. Цяперашні пэрыяд, які мы пачалі, зьяўляецца новым пэрыядам—рэканструкцыі і рэарганізацыі ўсёй нашай народнай гаспадаркі на новай тэхнічнай базе—пэрыяд новага капітальнага будаўніцтва. І вось, зьвязаныя з гэтым пэрыядам канкрэтныя задачы згодна вызначаных шляхоў разьвіцьця нашай дзяржавы, патрабуюць яшчэ большай энэргіі ад усіх працоўных мас, чым папярэдні пэрыяд, бо гэтыя задачы рэканструкцыі нашай гаспадаркі на новай тэхнічнай базе зьвязаны з неабходнасьцю максымальнага вывучэньня ўсіх тых дасягненьняў чалавецтва, якія ўжо ёсьць. Мы цяпер ужо мала гаворым аб агульных задачах будаўніцтва, бо яны ўжо няраз вызначаліся ў праграме, у пастановах зьездаў камуністычнай партыі, зьездаў саветаў і г. д. Мы цяпер гаворым ужо аб вырашэньні практычных задач у той ці іншай галіне нашага савецкага і гаспадарчага будаўніцтва.

Цяжкасьці ў нашым будаўніцтве.

Але на шляху практычнага ажыцьцяўленьня задач індустрыялізацыі дзяржавы мы спаткаемся з вялічэннымі цяжкасьцямі, якія ня толькі ня зьменшыліся, але ў шэрагу выпадку павялічыліся.

Галоўнай з гэтых цяжкасьцяй зьяўляецца тое, што мы будуем наша новае сацыялістычнае жыцьцё ў капіталістычным абкружэньні міру. Гэтая асноўная цяжкасьць увесь час адбіваецца і на нашай практычнай працы. Адначасна з гэтым, як вы ведаеце, мы ўсю нашую працу праводзім ва ўмовах клясавай барацьбы. Я павінен апошняе падкрэсьліць таму, што мы цяпер часам чуем такія думкі ў паасобных таварышоў, такія разважаньні, што ў нас, нібы цяпер, у пэрыяд мірнага будаўніцтва, няма клясавай барацьбы, што ва ўмовах мірнага сацыялістычнага будаўніцтва гуркі аб клясавай барацьбе павінны быць зусім адпасьці, што клясавая барацьба, па думцы гэтых таварышоў, скончылася тады, калі мы ліквідавалі грамадзянскія фронты. Такі погляд зьяўляецца зусім памылковым, няправільным.

Клясавая барацьба была, яна адбываецца і цяпер і будзе ісьці далей нават і ва ўмовах мірнага будаўніцтва. Яна будзе адбывацца да таго часу, пакуль будзе існаваць побач са сьветам сацыялізму сьвет капіталізму, пакуль будуць змагацца гэтыя дзьве сацыяльныя сыстэмы і пакуль першая сыстэма не пераможа другую,—будзе існаваць клясавая барацьба пралетарыяту з буржуазеяй.

Да тэй пары, пакуль існуюць яшчэ гэтыя два крайніх флангі, ня можа быць гутаркі, што ўмовы нашай мірнай працы зьяўляюцца ўмовамі працы бяз клясавай барацьбы. Клясавая барацьба ёсьць. Яна толькі зьмяніла свае формы; гэтыя формы ўжо ня тыя, якія выяўляліся ў часы грамадзянскай вайны, у часы, калі пралетарыят заваёўваў сабе ўладу.

Прынцыповы характар клясавай барацьбы застаецца і цяпер той-жа самы, але зьмяніліся формы. Раней, у часы грамадзянскай вайны, гэтыя формы заключаліся ў адкрытым выступленьні ўсіх контр-рэвалюцыйных сіл супраць пралетарыяту. Цяпер гэтыя формы заключаюцца ў тым, што на паасобных вучастках нашай мірнай гаспадарчай і культурнай працы то тут, то там прарываецца наш клясавы вораг, які спрабуе прарваць асновы нашай пралетарскай дыктатуры.

Яшчэ агульнае, што засталося ў клясавай барацьбе, што было ў часы грамадзянскай вайны і маецца сёньня, гэта тое, што ўсёй гэтай барацьбой капіталізму з пралетарскай дыктатурай кіраваў і кіруе міжнародны капіталізм і ў першую чаргу—капіталізм заходня-зэўрапейскіх дзяржаў.

Гэты момант застаецца і дагэтуль нязьменным, як нязьменным застаецца і прынцып клясавай барацьбы, хоць яна і зьмяніла свае формы. Міжнародны капіталізм раней вёў сваю барацьбу ня толькі шляхам подкупу асобных прадстаўнікоў падонкаў, тых, якія засталіся ў нас ад былых прывілегіраваных клясаў і іх арганізацыяў, але ён павёў гэту барацьбу таксама адкрытай, узброенай інтэрвэнцыяй. Але яму не ўдалося нас перамагчы. Пралетарыят аказаўся настолькі магутным, што ўсім ангельскім лёрдам і інш. капіталістам, якія спрабавалі заўладаць Савецкім Саюзам, даў, як сьлед, па руках.

Калі мы гаворым сёньня аб клясавай барацьбе і яе формах, мы таксама бачым няўхільную руку гэтага нашага галоўнага ворага—капіталізму замежных дзяржаў, які ўсё яшчэ хоча скарыстоўваць паасобныя адзінкі контр-рэвалюцыянэраў, з тых, што засталіся ўнутры Саюзу; схаваўшы свой твар, ён скарыстоўвае іх, як сваіх агентаў і праз іх хоча ўзарваць асновы нашага гаспадарчага будаўніцтва. І цяперашняя барацьба на эканамічным фронце, барацьба капіталізму супроць замацоўваньня нашай эканамічнай моды ёсьць таксама нішто іншае, як эканамічная інтэрвэнцыя, якая прыменена замежным капіталізмам пасьля ваеннай, у якой міжнародны капіталізм пацярпеў паражэньне.

Трэба таксама сказаць, што гэтая эканамічная інтэрвэнцыя, якая цяпер праводзіцца праз асобныя адзінкі і праз асобных удзельнікаў нашага гаспадарчага будаўніцтва, гэта таксама ёсьць ня што іншае, як падрыхтоўка да будучай узброенай інтэрвэнцыі, бо эканамічная моц СССР—ёсьць асноўны грунт, падстава абароназдольнасьці нашай краіны, а імпэрыялізм, які і думаць ня можа ўжыцца з савецкай сыстэмай, зразумела, рыхтуецца да зьнішчэньня савецкага ладу і сацыялістычнай сыстэмы. І першым крокам, які яму патрэбен для пасьпяховага вырашэньня сваёй імпэрыялістычнай задачы, зьяўляецца спроба эканамічнага падрыву ўсіх тых пачынаньняў, якія мы праводзілі, з тым, каб пасьля гэтага можна было пасьпяхова пачаць узброеную інтэрвэнцыю.

Наша задача — перагнаць тэхніку капіталістычнага сьвету.

І вось наша камуністычная партыя і савецкі ўрад, улічыўшы тыя ўмовы, у якіх мы пастаўлены,—умовы разьвіцьця сацыялістычнага будаўніцтва толькі ў адной дзяржаве, хоць, праўда, і вялікай, якая займае адну шостую частку ўсяго сьвету, але ў капіталістычным абкружэньні,—паставіла задачу—дагнаць і перагнаць капіталістычную тэхніку, з тым, каб не залежыць ад капіталістычнага міру. Такі лёзунг партыя дала ўжо даўно, і сёньня гэтае пытаньне аб павышэньні нашага тэхнічнага ўзроўню, аб тым, каб пераняць тыя тэхнічныя заваёвы і дасягненьні, якія маюцца ў капіталістычных дзяржавах, —гэта задача цяпер на фронце мірнага будаўніцтва зьяўляецца галоўнай. Ня буду гэтага паўтарыць, бо ўсе аб гэтым павінны ведаць, і Ільліч яшчэ пры сваім жыцьці сказаў, што сацыялізм будзе пабудован тады, калі ўся наша праца будзе грунтавацца на высокай кваліфікаванай навуковай тэхнічнай базе. Без падвядзеньня такой навуковай тэхнічнай базы пад нашае гаспадарчае разьвіцьцё, дарма гаварыць аб пасьпяховым будаўніцтве сацыялізму. І такая ўстаноўка прынята ва ўсёй нашай эканамічна-гаспадарчай працы, як партыяй і ўрадам, так і ўсім асноўным актывам рабочае клясы і ўсёй савецкай грамадзкасьцю. Сёньня пра гэтую ўстаноўку спрэчак у партыі няма, і няма ўжо спрэчак у шырокіх колах рабочых мас. Усе ведаюць, што адна з асноўных прадпасылак пасьпяховага прасоўваньня па шляху замацаваньня сацыялізму—гэта ёсьць падвядзеньне высокай тэхнічнай базы і плянавая арганізацыя ўсёй нашай народнай гаспадаркі.

Неабходна пашырыць кадр спэцыялістых.

Але нам цяжка ажыцьцяўляць гэтую практычную задачу, бо мы тут спаткаемся з шэрагам аб'ектыўных цяжкасьцяй. Папершае, нашая краіна раней, ды і цяпер яшчэ, вельмі значна адстала па тэхніцы сваей гаспадаркі ў параўнаньні з капіталістычнымі дзяржавамі, і дагнаць нам гэтую тэхніку ня так лёгка; падругое, у нас яшчэ няма вялікіх кадраў высокакваліфікаваных спэцыялістаў, а дагнаць і перагнаць капіталістычную тэхніку можна толькі тады, калі мы для гэтай задачы падымем пласты народных мас і калі мы з'арганізуем шырокія кады кваліфікаваных спэцыялістаў і паставім іх разгорнутым фронтам на выкананьне гэтай задачы. Вось чаму вы не адзін раз у пастановах партыйных органаў маглі знаходзіць такія пункты, у якіх выразна высьвятляўся і вызначаўся курс партыі і ўраду—у адносінах да вялікай арміі спэцыялістых, і вось чаму ў гэтых пастановах вы ня раз маглі чытаць—якое месца і якая роля вызначаецца у будаўніцтве сацыялізму, у агульнай арміі пралетарскіх будаўнікоў кадрам спэцыялістых. Вы ня раз чулі, што з боку ўраду прымаюцца ўсе неабходныя крокі, каб папоўніць кадры спэцыялістых новымі маладымі сіламі, бо спадчына ў галіне кадраў спэцыялістых нам засталася невялікая. Былая царская Расея была адной з дзяржаў, дзе процант інжынэраў, тэхнікаў, агранамаў і наогул кваліфікаваных працаўнікоў, адносна да занятых рабочых у вытворчасьці, быў самы меншы. Гэта значыць, што культурны ўзровень нашай былой царскай Расеі быў самы нізкі. Нават, калі параўнаць і цяпер колькасьць інжынэраў і тэхнікаў у нашай вытворчасьці з колькасьцю спэцыялістых у вытворчасьці замежных капіталістычных дзяржаў, то тут вы ўгледзіце вялікую разьбежку. У той час як, напрыклад, у некаторых капіталістычных краінах процант спэцыялістых у паасобных відах вытворчасьці даходзіць да 30—35 адносна да колькасьці ўсіх рабочых у гэтай вытворчасьці, то ў нас процант спэцыялістых, занятых у вытворчасьці нават не дасягае і 5 пр. Значыць, мы маем вельмі рэдкія шэрагі кваліфікаваных працаўнікоў, мы маем вельмі малыя кадры спэцыялістых.

Пагэтаму задача пашырэньня кадраў спэцыялістых стаяла і стаіць перад савецкай уладай, як галоўная задача, ад вырашэньня якой залежыць тэмп разьвіцьця сацыялістычнага будаўніцтва.

Але мне хочацца сказаць, што падрыхтоўка кваліфікаваных працаўнікоў з маладых нашых кадраў гэта таксама нялёгкая задача, нялёгкая таму, што мы ставім перад нашымі спэцыялістымі, перад нашымі новымі кадрамі вучоных людзей, якія цяпер фарміруюцца зусім іншыя мэты: мы ставім перад імі мэту аўладаньня ва ўсёй іх навуковай, навукова-дасьледчай і тэхнічнай працы ня толькі тэхнічнымі, спэцыяльнымі ведамі, а ў першую чаргу марксысцкімі мэтадамі. А я павінен вызначыць, што мы яшчэ ня зусім дастаткова змаглі ва ўсіх нашых навуковых і навучальных установах так паставіць асьвету, каб нашыя вучні маглі атрымаць тое, што мы разумеем пад славамі: «аўладаць марксысцкай зброяй». Часта мы наглядаем, што і выкладаньне ў нашых Вуз'ах зусім не адпавядае тым задачам, якія мы паставілі. На нашым зьезьдзе я гэта павінен адзначыць з усёй яскравасьцю. Мне прыходзілася крыху знаёміцца нават з паасобнымі навуковымі творамі як у галіне грамадзка-спэцыяльных і эканамічных навук, так і ў галіне сельскай гаспадаркі, і грамадзка-прававых навук, і па праўдзе вам прызнаюся, што пажадаў-бы яшчэ шмат чаго лепшага для тэй прадукцыі, якая выходзіць часта з нашага друку, на якой выхоўваюцца дзесяткі і сотні тысяч будучых будаўнікоў. Я ня буду спасылацца на аўтараў, але павінен сказаць, што мне прыходзілася спаткацца з такою літаратураю, якую з поўным правам можна назваць нэо-народніцкай ці ідэалістычна-буржуазнай творыяй, і вось такія творы выходзяць у 1927 г. ва ўмовах моцнай дыктатуры пралетарыяту ў Савецкім Саюзе. І на гэтай нэо-народніцкай і ідэалістычнай літаратуры, як у пытаньнях сельска-гаспадарчай эканомікі і аграрнай палітыкі, так і ў грамадзка-прававых і эканамічных дысцыплінах выхоўваюцца дзесяткі і нават сотні тысяч маладых людзей.

Так што пытаньне аб папаўненьні кадраў нехапаючых нам спэцыялістых, пытаньне аб выхаваньні іх, гэта таксама цяжкае пытаньне. Я таму гаварыў гэта на вашым зьезьдзе, што на вас ляжыць задача ня толькі прымаць актыўны практычны ўдзел у будаўніцтве народнай гаспадаркі, але і імкнуцца да таго, каб падрыхтаваць сабе памоцнікаў, хоць я ведаю, што шмат хто з вас не працуе ў пэдагагічнай галіне. Кожны працаўнік, дзе бы ён ні працаваў з высокай кваліфікацыяй, кожны працаўнік з высокай асьветай павінен думаць ня толькі аб тым, каб на 100 проц. скарыстаць свае веды для будаўніцтва сацыялізму, але яшчэ аб тым, каб свае веды перадаць іншым і перадаць так, каб яны адпавядалі запатрабаваньням нашага сучаснага дня.

Урад дапамагае спэцыялістым.

Савецкі ўрад прымае шмат крокаў, каб павялічыць кадры спэцыялістых, каб паставіць іх у лепшыя ўмовы працы. Савецкі ўрад думае ня толькі пра тое, каб падрыхтаваць новыя кадры, але таксама і аб тым, каб і палегчыць умовы працуючых спэцыялістых, даць ім магчымасьць усё больш павышаць сваю кваліфікацыю. Дзеля гэтага мы ў апошнія гады зьвярталі асаблівую ўвагу, напрыклад, на дакваліфікацыю працаючых спэцыялістых, занятых у нашай гаспадарцы. Дзеля гэтага мы ставім пытаньне і аб замежных камандыроўках нашых спэцыялістых, ня гледзячы на тое, што гэтыя камандыроўкі каштуюць вельмі дорага дзяржаве, і ня толькі таму, што дзяржава траціць сродкі па гэта, але і таму, што нам прыходзіцца перамагаць цяжкія перашкоды, якія нам ставяць капіталістычныя прадпрыемцы, якія не ахвотна дапушчаюць нашых спэцыялістых знаёміцца з апошнімі дасягненьнямі навукі і тэхнікі,—паўтараю, хаця мы маем вельмі многа перашкод у гэтай справе, але ўрад ня спыняецца перад усім гэтым, каб павялічыць кваліфікацыю нашых спэцыялістых. Мы спаткаліся з такімі зьявішчамі, калі нашых інжынэраў нават ня пускалі знаёміцца з фабрыкамі і заводамі ў паасобных капіталістычных краінах, бо кожны капіталіст у нашых працаўнікох, працуючых у Савецкім Саюзе, бачыць камуніста, які нібыта прыехаў агітаваць сярод рабочых за пралетарскую рэвалюцыю. Ня гледзячы на ўсе гэтыя дзяржасьці, мы пытаньне аб дакваліфікацыі працуючых спэцыялістых ставім ва ўсю шырыню і з кожным годам стараемся гэтую справу пашырыць.

Шахцінская справа не парушыць лініі ўраду ў адносінах да спэцыялістых.

Мне хочыцца спыніцца яшчэ на адным пытаньні, якое сёньня зьяўляецца «злобай дня» ў колах спэцыялістых, гэта пытаньне аб шахцінскім злачынстве, якое пачалося слухацца ў Вярхоўным Судзе СССР. Я хачу спыніцца на гэтым пытаньні ня толькі таму, што гэта «ў модзе», а і таму, што яно самому ў гутарках з паасобнымі спэцыялістымі, нават з вельмі сумленнымі, якіх я ведаю ўжо дзесяткі год, якім мы верым на 100 проц., прышлося чуць неправіўдзівыя разважаньні, некаторыя спэцыялісты ў прыватнай гутарцы запытваліся ў мяне: «ці ня выдумана ўся гэтая шахцінская справа, ці ня выдумалі яе, каб каго-небудзь заінтрыгаваць? Ёсьць такія гутаркі, калі некаторыя разважаюць нават, што тыя інжынэры, якія былі арыштаваны ў зьвязку з гэтым злачынствам, нібыта зусім невінаваты, што там больш вінаваты кіраўнікі камуністы, усе тыя гаспадарчыя працаўнікі, што там працавалі. Я вельмі ўдзячан за такую адкрытую пастаноўку пытаньня, бо гэта, як кажуць, чыстасардэчная пастаноўка. Але яна гаворыць аб тым, што ў колах спэцыялістых ходзяць розныя толкі, часта зусім памылковыя думкі аб тым, што савецкая ўлада зусім дарэмна падняла такі шум навокал шахцінскай справы.

На гэтае пытаньне я магу даць толькі адзін адказ, што такія разважаньні зусім няправільны. Апублікаваны акт абвінавачаньня па шахцінскай справе ясна сьведчыць аб тым, што тут справа больш сур'ёзная, чым толькі адзін промах і нядбайнасьць таго ці іншага кіруючага працаўніка. З тых матар'ялаў, якія паказаны суду аб шахцінскай контр-рэвалюцыі, відаць, што тут працавала злачынная рука, кіруючая нават і з-за межаў; што былыя гаспадары шахт, якіх рэвалюцыя выгнала з Савецкага Саюзу, прымалі актыўны ўдзел у шахцінскім шкодніцтве, і што многія спэцыялісты, што цяпер знаходзяцца перад судом, верна служылі сваім капіталістычным гаспадарам, атрымоўваючы ад іх рэгулярна ў некалькі разоў большыя сумы, чым тыя спэцыяльныя стаўкі, якія мы плацілі ім, што ўсе гэтыя спэцыялісты сыстэматычна на працягу некалькіх год працавалі над тым, каб падарваць падставы важнейшага гаспадарчага раёну.

Я многа аб гэтым гаварыць ня буду, досыць прачытаць матар'ялы аб гэтай справе, якія надрукаваны ў газэтах, каб узяць сябе, што тут ня можа і ў думках стаць пытаньне, нібыта ўся гэта справа надумана. Мы тут спаткаемся з досыць здольнай, вельмі шкоднай шырокай арганізацыяй контр-рэвалюцыянэраў, якія адыгрывалі такую самую ролю, якую некалі адыгрывалі паасобныя афіцэры старой арміі, аставаўшыяся ў нас. Зразумела, што заходня-эўрапейскі капіталізм, каб праводзіць сваю шкодніцкую дзейнасьць, павінен мець спэцыяльных агентаў унутры СССР, і толькі дзякуючы таму, што ён знайшоў такіх агентаў у асобе гэтых шахцінскіх злачынцаў, ён мог на працягу некалькіх год праводзіць такую шкодніцкую працу па эканамічнаму падрыву, эканамічнай інтэрвэнцыі Савецкага Саюзу. Такое-ж зьявішча мы наглядалі і ў часы грамадзянскай вайны, калі значна большая частка каманднага складу, застаўшаяся ў нас, аддана і шчыра стала на абарону заваёваў Кастрычніка, а паасобныя прахвосты аказаліся праваканатарамі і шчыра выконвалі заданьні контр-рэвалюцыі ў нашай Чырвонай арміі. У шахцінскай справе няма нічога новага, бо вы такое зьявішча наглядалі ў часы грамадзянскай вайны на грамадзянскім фронце, калі сярод старых кадраў камандзнага складу побач з лепшай часткаю іх, якая ўсё сваё жыцьцё аддала на тое, каб вывучыць пралетарыят перамагаць буржуазею ўзброенай рукой, аказаліся асобныя прахвосты, якіх вельмі добра скарыстоўвала контр-рэвалюцыя. Такое-ж зьявішча мы маем цяпер у шахцінскай справе.

Тут узьнікае пытаньне: чаму гэта некалькі гадоў усё было ціха. І толькі цяпер раптам ускрылася ўся гэта шкодніцкая праца і савецкая ўлада так многа шуміць пра гэта? Ці ня ёсьць гэта перамена лініі савецкай улады адносна да спэцыялістых—запытваюцца некаторыя.

Я павінен адзначыць, што ні аб якой перамене лініі партыі і ўраду адносна да спэцыялістых няма і ня можа быць разгавору. Ніхто аб гэтым ня думае і ня будзе думаць. Генэральная лінія партыі ў адносінах да спэцыялістых намечана нашаю праграмаю, намечана Ільлічом і правільна намечана, ды начала шэрагам пастаноў партыйных і савецкіх зьездаў і ніхто яе пераглядаць ня думае. Роля спэцыялістых у нашай сыстэме сацыялістычнага будаўніцтва застаецца такою-ж і надалей; гата роля вельмі вялікая. Гэта ўсюды падкрэсьліваецца, мы гэта ўсюды высьвятляем і на справе паказваем, што спэцыялісты павінны займаць належнае месца ў сыстэме сацыялістычнага будаўніцтва. Аб пераглядзе нашай прынцыповай лініі няма ніякіх разгавораў, і тыя хістаньні, якія я сам наглядаў сярод некаторых спэцыялістых, тыя непаразуменьні ў зьвязку з гэтым, ня маюць пад сабою ніякай падставы.

У шахцінскай справе мы маем звычайную контр-рэвалюцыйную спробу досыць буйнага маштабу, па якой савецкая ўлада б'е і будзе біць, як раней біла па Ўрангелю, Дзянікіну і інш., як біла ўсякі контр-рэвалюцыйны вылаз і ўсякую спробу скарыстаць давер'е савецкай улады на шкоду нам. У такіх выпадках мы заўсёды каралі і будзем караць моцнай пралетарскай рукою, да якой-бы сацыяльнай праслойкі гэты контр-рэвалюцыянэр ні належыў. Тут нас мала цікавіць, якія рангі і які сацыяльны «чын» мае той ці іншы шкоднік нашай гаспадаркі. Мы да кожнай такой справы падыходзім і ацэньваем па дзейнасьці яе, ацэньваем па тым, як той ці іншы чалавек робіць. Але гэтая шахцінская справа зусім не адзначае і ня можа адзначыць ні ў якім разе якой бы то ні было перамены лініі адносна спэцыялістых, і ўсякія непаразуменьні, якія могуць узьнікнуць сярод паасобных спэцыялістых у зьвязку з шахцінскай справаю, зьяўляюцца зусім лішнімі і няправільнымі. У шахцінскай справе няма нічога, што адрозьнівалася-б ад усякае іншае справы ўсякай загаворшчыцкай контр-рэвалюцыйнай арганізацыі, яна толькі буйнага маштабу контр-рэвалюцыйная справа. Вось як трэба расцэньваць гэтую справу і гэты працэс.

Прынцыпы нашай праграмы, прынцып лініі ўраду заключаюцца ў тым, каб кожнага, хто сумленна працуе на карысьць сацыялістычнаму будаўніцтву, цалкам на 100 прац. прыцягнуць для працы на карысьць пралетарскай рэвалюцыі, даўшы яму адпаведныя ўмовы, адпаведнае месца. Вось гэта ёсьць наш лёзунг, наша задача, якая застаецца і надалей.

Нашы канкрэтныя задачы.

У заключэньне маёй прамовы я хацеў-бы намаляваць некаторыя канкрэтныя задачы, якія стаяць перад вашым зьездам:

Першае, што я лічу патрэбным падкрэсьліць перад вамі—гэта тое, што ваш зьезд павінен яшчэ больш і мацней згуртаваць усіх спэцыялістых на Беларусі, каб яшчэ больш актыўна працаваць над разьвіцьцём нашай краіны, над адраджэньнем Беларусі, над падняцьцем культурнага і тэхнічнага ўзроўню нашай народнай гаспадаркі.

Другая задача: зьезд павінен даць лёзунг (і яго трэба будзе ажыцьцявіць), каб усе дасягненьні навуковай думкі, якія выяўляюцца нашымі спэцыялістымі, адразу станавіліся маемасьцю шырокіх мас працоўных. І разам з гэтым трэба так паставіць пытаньне, каб адначасна з выяўленьнем навуковай думкі скарыстать той вялічэзны вопыт пралетарыяту ўсяго СССР і БССР, якога ня мае пралетарыят ніводнай буржуазнай краіны, вопыт практычнага будаўніцтва. Лёзунг—аб'яднаньня навукі з працаю цяпер ня можа стаяць у абстрактнай форме. Цяпер пытаньне павінна стаяць так, што ўсякая навуковая думка, якая выяўляецца па тэй ці іншай канкрэтнай справе, павінна быць адразу прыналежнасьцю шырокіх масаў, і ў той-жа час яна павінна ажыцьцяўляцца ў цеснай сувязі з практычным вопытам працоўных мас.

Трэцяя задача: мне здаецца, што ўсю сваю ўвагу спэцыялістыя Беларусі павінны накіраваць на замацаваньне аграмаднага сэктару народнай гаспадаркі. Я тут асабліва хачу спыніцца на сельскай гаспадарцы, дзе гэтая справа замацаваньня і пашырэньня аграмаднага сэктару можа праходзіць пры больш цяжкіх умовах, з больш павольным тэмпам, чым, скажам, у прамысловасьці. Тут на вялікі жаль мы бачым, што ў нашых навуковых і навучальных установах, асабліва ў навучальных, мала адводзіцца месца і мала зьвяртаецца ўвагі на тое, як студэнтаў вучыць таму, каб замацоўваць аграмаджаны сэктар сельскай гаспадаркі і сэктар індустрыялізацыі. Можа некаторыя паскардзяцца за гэта, але мы павінны сказаць тое, што ёсьць. Мы яшчэ ў нашых навучальных праграмах нашых ВУЗ'аў «вітаем» больш па шляху, так зван., «грамадзкай агранамі», але пад гэтай зусім бязгрэшнай формулай, нават сучаснай формулай, агранамічная думка накіроўваецца выключна на абслугоўваньне толькі адзіналічных гаспадарак, а не на калектывізацыю сельскай гаспадаркі. Я ад усяго сэрдца вітаю разьвіцьцё грамадзкай агранаміі, але толькі тады, калі яна пойдзе не па шляху хутароў, а будзе ісьці на ўсё большае ўцягненьне асобных сялянскіх гаспадарак у аграмаджаны сэктар, сацыялістычны сэктар. Тая ўстаноўка ў гэтым пытаньні, якая ўзята нашай партыяй і ўладаю па калектывізацыі сельскай гаспадаркі, павінна адбіцца ўперад за ўсё ў нашых вышэйшых навучальных установах, каб студэнт мог гэта адчуваць у сваёй штодзённай тэарэтычнай навуковай працы. Тут гэтае пытаньне ў нас крыху слабенькае. Таму я лічу, што пытаньне аб пабудове гадавых навучальных плянаў нашых спэцыяльных вышэйшых навучальных устаноў цалкам дагучыць і да спэцыялістых, да прафсаюзаў, да вашага зьезду. Ваш зьезд павінен даць лёзунг, каб уся інжынэрна-тэхнічная грамадзкасьць, усе спэцыялістыя, працуючыя ў прамысловасьці, сельскай гаспадарцы ўсе свае сілы накіравалі ў першую чаргу на замацаваньне аграмаджанага сэктару народнай гаспадаркі.

Чацьвертая задача: ваш зьезд павінен даць лёзунг ачысткі сваіх шэрагаў, шэрагаў сумленна і шчыра працуючых на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, ад прымазаўшыхся, якія могуць быць і якія могуць шкодзіць нашай працы.

Пятая задача: мне здаецца, што трэба пашырыць работу па вывучэньні вытворчых сіл нашай Беларусі, па вывучэньні яе энэргетычных рэсурсаў, якія заложаны ў нашай краіне. Наша Беларусь амаль што горш, чым усякая іншая краіна былой царскай Расіі, вывучана ў гэтых адносінах. У нас зусім мала вывучаны нашы ўласныя вытворчыя сродкі, нашы ўласныя энэргетычныя рэсурсы. Нам цяпер вельмі цяжка будаваць новую прамысловасьць і нават паднімать сельскую гаспадарку, бо ў нас мала навуковых досьледаў, якія-б далі малюнак аб тым, што ў нас ёсьць, якія ў нас пэрспэктывы. Мы будуем нашыя праграмы, трацім сродкі, складаем каштарысы, але, калі мы хочам склаьці поўныя пэрспэктывы ў прамысловым будаўніцтве, альбо ў сельскай гаспадарцы, то вельмі часта адчуваецца, што ў нас не хапае навукова-распрацаваных матар'ялаў, каб абгрунтаваць усе нашыя пляны. Дзеля гэтага задача вывучэньня ўласных вытворчых сіл і энэргетычных рэсурсаў у Беларусі таксама зьяўляецца першачарговай задачай для вашага зьезду.

Я ўпэўнен у тым, што вопыт працы, які мы ўжо маем, працы вашай сэкцыі і ўсіх спэцыялістых Беларусі, гаворыць аб тым, што мы стаім на правільным шляху, што мы ўжо шмат чаго пасьпелі ў нашым будаўніцтве і што далей мы пойдзем яшчэ больш шпаркімі крокамі да будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне. Я ўпэўнен у тым, што з гэтага шляху, на якім мы стаім, па якім стаіць большасьць інжынэрна-тэхнічных сіл, ніякі клясавы вораг унутры нашай краіны і ніякі замежны капіталізм ня зможа нас зрушыць. Я ўпэўнен у тым, што мы ў далейшым будзем таксама пасьпяхова працаваць над тым, каб наша сацыялістычная гаспадарка сапраўды перагнала гаспадарку капіталістычнага міру. (Бурныя воплескі).

НА КАНТРОЛЬ МАС.

„Жывая сувязь" Магілеўскага Акрза.

«ДАКУЛЬ НАС БУДУЦЬ ВАЛАВОДЗІЦЬ».

Справа пачалася яшчэ вясною 1928 году, а цягнецца яна і па гэты час.

Прыехаў гэта тады ў вёску Збышын (Чачэвіцкага райёну) інструктар і прапанаваў склаьці мэліарацыйнае таварыства для асушкі вурочышча «Бэрэц», якое знаходзіцца ў Немкаўскім лясьніцтве.

Мелі ўжо горкі вопыт з гэтым Бэрэцам, але як інструктар расьпінаўся, што зараз лясьніцтва перадасьць гэта вурочышча і што нічога пахожага да таго, што было, ужо ня будзе, згадзіліся сяляне арганізаваць таварыства (сенажаць вельмі патрэбна!).

Запісалася 25 чалавек беднаты, склалі статут, далі ўпаўнаважаным грошы на папярэднія выдаткі і загадалі ім дзейнічаць.

За трэцім прыездам упаўнаважаных лясьніцтва дало згоду на перадачу вурочышча. Перадалі справу на зацьверджаньне ў Магілеўскі акруговы земаддзел.

Чакаць-пачакаць адказу ад земаддзелу,—ня чутна. Ужо і лета прайшло, надзея на сенажаць прапала. І ўвосені 1926 г. збышанцы яшчэ раз зьбіраюць грошы і пасылаюць хадакоў ізноў.

Зьвярнуліся хадакі. Апавядаюць:—У перадачы вурочышча ў працоўнае карыстаньне сялянству адмоўлена, але земаддзел даў згоду, каб лясьніцтва аддало яго нам часова, на 8 год, мы павінны гэтую плошчу палепшыць і карыстацца ёю дармова.

Абураны сяляне (памятаюць словы інструктара, што больш валакіты ня будзе), але-ж ухваляюць працягваць пачатую справу.

У трэці раз сабралі грошы на выдаткі ўпаўнаважаным.

Ледзь у сакавіку 1927 г. давялося зрабіць дагавор з лясьнічым на арэнду вучастка. Разоў шэсьць прышлося даведацца ў лясьніцтва.

Паслалі дагавор у земаддзел.

Зноў адказу ніякага няма. Яшчэ раз прапала надзея на скос балота.

Ня было адказу і ўвосені, не давялося і восеньню распачаць працу па палепшаньні балота.

Надыйшоў і 1928 г. Ужо і вясна выходзіць, хутка сенакос, а земаддзел...

А земаддзел маўчыць, нібы і няма яго на сьвеце.

Наладзілі ўпаўнаважаныя сходку. Кажуць:

— Трэба яшчэ раз сабраць грошы, даведацца ў земаддзел...

— Досыць! — гаркнулі тут усе:— дакуль гэта будуць нас валаводзіць?! Вось табе і барацьба з бюракратызмам...

К-вік.

„Аўтадор" пры заводзе „Энэргія".

Пры ўваходзе ў панадворак заводу «Энэргія» бачыш розныя карпусы, новыя і старыя. Ідучы каля новага лідэйнага цэху, трэба завярнуць да старога будынку заводу Энэргія.

Тут, ня хочучы, наткнешся на рэч, якая ў адзіноцтве стаіць сярод дарогі.

Стаіць аўтамабіль з паламаным колам каля 2 месяцаў на панадворку заводу «Энэргія», а на ім выразна красуецца надпіс: «АЎТАДОР» пры заводзе «Энэргія».

Аўтадор—арганізацыя маладая, і ня варта было-б зьдзеквацца над ёю. Але, трымаючы доўгі час паламаны аўтамабіль, які перахіліўся на бок і гэтым нібы падкрэсьлівае горкую гіронію ў надпісе—«Аўтадор пры заводзе «Энэргія»—арганізацыя сама напрашваецца на зьдзек.

Калі ячэйка Аўтадору ня мае сродкаў, каб набыць спраўны аўтамабіль, які адпавядаў-бы надпісу на ім, дык гэты «Аўтадор»—не Аўтадор. Трэба запрэгчы якую-небудзь кульгавую кабылу і адвезьці гэты, выбачайце, „Аўтадор" куды-небудзь у кут, каб ён вачэй ня муляў.

С. Аз.

ЯК ХАДЫКА ПРАВОДЗІЎ САМААБКЛАДАНЬНЕ

У Кляніцкім с-савеце зусім няма дзяржаўных будынкаў, а таму няма дзе зьмясьціцца ні школам, ні сельсавету, ні мэдыцынскаму пункту, адчыненьня якога ледзь-ледзь удалося дабіцца.

Калі гэта добра было растлумачана сялянам вёскі Клянік, дык яны згадзіліся правесьці самаабкладаньне на 25 проц., і гэта сяляне, з якіх 15—20 проц. сераднякі, а рэшта бедната. Асталася справа і галоўны голас за рэштай пунктаў сельсавету, дзе ёсьць частка заможнікаў і большая, і таму самая важная, частка беднаты.

Ці то недаверыўшы гэту справу, правядзеньня самаабкладаньня, работнікам сельсавету, ці то захацелася паказаць свой «арацэрскі» талент, але досыць таго, што дакладчыкам у в. Забалоцьце (райён бедны) выехаў сэкратар Смалявіцкага РВК Хадыка. Яшчэ ўперад сяляне вёскі Забалоцьце гаварылі, што мы ад Кляніка не адстанем, правядзём самаабкладаньне, бо на добрую справу, як пабудова мэдпункту, ніхто не адмовіцца.

Сабраліся забалачане на сход і тутжа т. Хадыка так пачаў грызьціся з сялянамі, лаяць, што ўсе памалу пачалі разыходзіцца са сходу, а некаторыя сьмялейшыя яму з-за плячоў пусьцілі:

— Што-ж гэта?.. Няўжо губарнатар царскі адрынуўся?..

— Жандар даўней і то лепш гаварыў з народам!..

Потым справа дайшла да таго, што (паміж намі кажучы) Хадыка ледзь ня браўся за «наган». І што-ж у выніку?.. А тое, што і трэба было чакаць у такім разе. Сяляне ня толькі ня прынялі самаабкладаньня, але настолькі нездаволенымі засталіся, што пасьля «арацэрства» Хадыка трэба было разы тры рабіць сходы, каб яны згадзіліся.

А потым гаварылі:—Мы згаджаемся, згадзіліся-б і раней, каб не Хадыка!.. Прыехаў-бы другі раз і мы вон яго выпраў!..

Вот плён «умелага» падыходу к сялянству!..

Гэта лішні раз падкрэсьлівае, што некаторыя работнікі РВК з сваім цяпер набытым камчванствам зусім далёкі ад сялянства. А гэтакімі рэчамі жартаваць нельга, асабліва сярод беднаты цэлай вёскі!..

М Я.

Трэба скарэй вырашаць.

Мы ўвесь час у друку і на ўсякіх нарадах абгаварываем пытаньне аб тым, як наш апарат зрабіць больш танным і адпавядаючым запытаньням сёньняшняга дню. У гэтым напрамку зроблена органамі РСІ ўжо вельмі многа, але яшчэ шмат чаго і

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

ПАСТАНОВА

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

пра зьмену арт. 2 пастановы Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР „Пра адкліканьне выбаршчыкамі з саветаў выбраных імі депутатаў".

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе: запісаць арт. 2 сваёй пастановы ад 30 сьнежня 1927 г. „Пра адкліканьне выбаршчыкамі з саветаў выбраных імі депутатаў" (Збор З. за 1928 г. № 4, арт. 22), у наступнай рэдакцыі:

«2. Пытаньне аб адкліканьні депутатаў з савету можа быць паднята выбаршчыкамі данага выбарчага вучастку ў ліку ня менш 10 чалавек, а таксама прафесыянальнымі арганізацыямі, сялянскімі таварыствамі ўзаемаданамогі, делегацкімі сходамі жанчын і іншымі грамадзянскімі арганізацыямі, а таксама гарадзкімі, сельскімі і местачковымі саветамі і вышэйстаячымі выканаўчымі камітэтамі».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

7 чэрвеня, 1928 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Президиума Центрального Исполнительного Комитета БССР

об изменении ст. 2-й постановления Президиума Центрального Исполнительного Комитета БССР «Об отзыве избирателями из советов избранных ими депутатов».

Президиум Центрального Исполнительного Комитета БССР постановляет: изложить статью 2 своего постановления от 30 декабря 1927 г. «Об отзыве избирателями из советов избранных ими депутатов» (Собр. З. за 1928 г. № 4, ст. 22) в следующей редакции:

„2. Вопрос об отзыве депутатов из совета может быть поднят избирателями данного избирательного участка в количестве не менее 10 человек, а также профессиональными организациями, крестьянскими обществами взаимопомощи, делегатскими собраниями женщин и другими общественными организациями, а также городскими, сельскими и местечковыми советами и вышестоящими исполнительными комитетами".

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

7 июня, 1928 г.
г. Минск.

ПАСТАНОВА

Савету Народных Камісараў БССР

пра парадак вылічэньня адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў на 1928-29 г. па каштарысах ведамстваў і ўстаноў, што знаходзяцца на дзяржаўным і мясцовым бюджэтах БССР.

На падставе пастановы СНК СССР за 15 мая 1928 году «Пра парадак вылічэньня адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў на 1928-29 г. па каштарысах ведамстваў і ўстаноў, што знаходзяцца на агульна-дзяржаўным і мясцовым бюджэтах» (газ. Известия ЦИК СССР и ВЦИК РСФСР» 1928 г., № 113) Савет Народных Камісараў пастанаўляе:

1. Абавязаць ведамствы і ўстановы, што знаходзяцца на дзяржаўным і мясцовым бюджэтах, вылічаць асигнаваньні на адміністрацыйна-кіраўнічыя выдаткі на каштарысах на 1928-29 г., грунтуючыся на наступных асноўных палажэньнях:

а) у каштарысах на 1928-29 г., апроч вымацаваньня праведзенага ў 1927-28 г. скарачэньня адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў, павінна быць, як агульнае правіла, прадугледжана далейшае зьніжэньне памянёных выдаткаў. Зьніжэньне гэта павінна быць зроблена праз рацыяналізацыю апарату, скарачэньне лішніх функцый, спрашчэньне справаздачнасьці, а таксама праз далейшае скарачэньне выдаткаў на утрыманьне і абслугоўваньне памяшканьняў кіраўнічых органаў, на камандыроўкі адміністрацыйнага характару, на ведамсьцьвенныя выданьні, на абслугоўваньне выездаў і нарад і інш.;

б) асигнаваньні, прадугледжаныя ў каштарысах на 1927-28 г. на патрэбы, якія былі толькі ў бягучым годзе і ня будуць паўтарацца ў наступным годзе, павінны быць выключаны пры вызначэньні ўзроўню адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў у каштарысах на 1928-29 г.;

в) сродкі на новыя патрэбы адміністрацыйна-кіраўнічага характару, якія могуць быць у 1928-29 г., павінны быць знойдзены ўнутры каштарысу данага ведамства ці ўстановы з эканоміі ад скарачэньня адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў паводле п. «а» гэтага артыкулу, у паасобку, з унутранай рэарганізацыі апарату. Ва ўсякім разе агульная сума адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў у каштарысе кожнага ведамства ці ўстановы, уключаючы і выдаткі на новыя патрэбы, не павінна перавышаць агульнай сумы адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў, назначаных данаму ведамству ці ўстанове ў бюджэце 1927-28 году.

2. Даручыць Народнаму Камісарыяту Фінансаў БССР і Народнаму Камісарыяту Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі БССР выдаць на працягу двух тыдняў інструкцыю пра ўжываньне гэтай пастановы ў паасобку, даць дырэктывы аб парадку вылічэньня адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў у каштарысах спэцыяльных сродкаў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Нам. Кіраўніка Справы Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР Н. Угараў.

11 чэрвеня, 1928 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Совета Народных Комиссаров БССР

о порядке исчисления административно-управленческих расходов на 1928-29 г. по сметам ведомств и учреждений, состоящих на государственном и местном бюджетах БССР.

На основании постановления СНК СССР от 15 мая 1928 г. «О порядке исчисления административно-управленческих расходов на 1928-29 г. по сметам ведомств и учреждений, состоящих на общегосударственном и местном бюджетах» (Газ. «Известия ЦИК СССР и ВЦИК РСФСР» 1928 г. № 113) Совет Народных Комиссаров БССР постановляет:

1. Обязать ведомства и учреждения, состоящие на государственном и местном бюджетах, производить исчисление ассигнований на административно-управленческие расходы по сметам на 1928-29 г., исходя из следующих основных положений:

а) в сметах на 1928-29 г., помимо закрепления проведенного в 1927-28 г. сокращения административно-управленческих расходов, должно быть, по общему правилу, предусмотрено дальнейшее снижение упомянутых расходов. Снижение это должно быть осуществлено путем рационализации аппарата, устранения из лишних функций, упрощения отчетности, а также путем дальнейшего сокращения расходов на содержание и обслуживание помещений управленческих органов, на командировки административного характера, на ведомственные издания, на обслуживание с'ездов и совещаний и т. п.;

б) ассигнования, предусмотренные по сметам 1927-28 года на потребности, имеющие место только в данном году и не повторяющиеся в предстоящем году, подлежат исключению при определении уровня административно-управленческих расходов по сметам на 1928-29 год;

в) средства на новые потребности административно-управленческого характера, могущие иметь место в 1928-29 году, должны быть изысканы внутри сметы данного ведомства или учреждения за счет экономии от сокращения административно-управленческих расходов согласно п. «а» настоящей статьи, в частности, за счет внутренней реорганизации аппарата. Во всяком случае общая сумма административно-управленческих расходов по смете каждого ведомства или учреждения, включая и расходы на новые нужды, не должна превышать общей суммы административно-управленческих расходов, назначенных данному ведомству или учреждению по бюджету 1927-28 года.

2. Поручить Народному Комиссариату Финансов БССР и Народному Комиссариату Рабоче Крестьянской Инспекции БССР издать в двухнедельный срок инструкцию по применению настоящего постановления, в частности дать указания о порядке исчисления административно-управленческих расходов по сметам специальных средств.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Зам. Управляющего Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР Н. Угаров.

11, июня 1928 года.
г. Минск.

ХРОНІКА.

Фінансаваньне пабудовы трамваю.

Прэзыдыум Дзяржаўнай Пляновай Камісіі заслухаў інфармацыю будаўніча-транспартнай сэкцыі аб фінансаваньні пабудовы трамваю ў Менску.

Агульны кошт пабудовы трамваю першай чаргі перавысіць 2.650.000 руб. Апроч таго будуць зроблены значныя выдаткі на пераноску тэлефонных і тэлеграфных ліній і вадаправоднай сеткі.

На пакрыцьцё гэтай сумы банк адпусьціць доўгатэрміновы крэдыт у суме 1 міліёну рублёў; па дзяржаўнаму бюджэту будзе адпушчана 600 тысяч рублёў; па мясцоваму—850 тысяч рублёў і ў рахунак грамадзкіх работ—100 тысяч рублёў.

Сродкі будуць адпускацца па гадох наступным парадкам: у 1927-1928 годзе 436 тысяч, у 1928-29—1.300 тысяч і ў 1929-1930 годзе—914 тысяч рублёў.

Пабудова трамваю пачнецца адразу пасьля зацьвярджэньня праэктаў. У першую чаргу будзе будавацца асноўная лінія—станцыя МББ—Камароўка. Гэта лінія, згодна меркаваньню Дзяржаўнай Пляновай Камісіі, павінна быць скончана ў 1928-29 годзе. Рэшта работ першай чаргі—у 1930 годзе.

Менскаму акруговаму выканаўчаму камітэту даручана ўвязаць пабудову трамваю з пракладкаю каналізацыйных труб.

Электрастанцыя ў першыя гады можа забясьпечыць трамвай неабходнай электра-энэргіяй, аднак, у далейшым, у зьвязку з пашырэньнем колькасьці электрыфікаваньня прамысловых прадпрыёмстваў, патрэбнай колькасьці энэргіі станцыя даць ня зможа. Акруговаму выканаўчаму камітэту даручана прадставіць Дзяржаўнай Пляновай Камісіі сваё меркаваньні адносна пашырэньня электрастанцыі.

Выхад піянэраў ў лягеры.

20 чэрвеня распачынаецца выхад піянэраў Менскай акругі ў лягеры.

Ужо вызначаны месцы для правядзеньня лягераў, а таксама праведзен па ўсіх піянэрскіх атрадах мэдыцынскі агляд.

У лягеры піянэры прабудуць 2-3 тыдні.

Усяго выйдзе ў лягеры каля 3000 піянэраў.

У часе прабываньне ў лягерах, піянэры будуць аказваць сельска-гаспадарчую дапамогу бяднейшаму сялянству.

Будзе таксама праведзена вялікая праца па ўцягненьні неарганізаваных дзяцей ў піянэрскія арганізацыі.

Сродкі на правядзеньне лягернай кампаніі адпускаюць прафсаюзныя і піянэрскія арганізацыі.

Радкае зьявішча прыроды.

Селянін вёскі Мацкевічы, Капыльскага раёну гатымі дням паведаміў інбелкульт аб тым, што ў іх вёсцы нарадзілася нашчынё, якое мае—на галаве два рты, 8 ног і 2 жываты. Гэта вельмі рэдкае зьявішча прыроды, але на жаль, нашчынё здохла, і невядома куды выкінута.

Радыёфікацыя Беларусі.

У 1928 годзе ў БССР мяркуецца значна пашырыць радыёфікацыю. На гэту справу асигнавана 57 тысяч рублёў. У 80 хатах-чытальнях і нардамох будуць пабудаваны радыёўстаноўкі. У Менску мяркуецца паставіць цэнтральны ўсіліцель для 30 гучнагаварыцеляў. Вялікая ўвага будзе зьвернута на радыёфікацыю вёсак.

Сёньня—выхад студэнтаў ў лягеры.

Студэнты 2-га курсу ўсіх факультэтаў БДУ сёньня выходзяць у лягеры, дзе яны прабудут 2 месяцы.

У часе лягернага збору студэнты тэарэтычныя вайсковыя веды, набытыя ў унівэрсытэце, папоўняць практычнымі веламі, каб у патрэбны момант умець адстойваць заваёвы Кастрычніка.

Дапамога палітвязьням.

Цэнтральны Камітэт Мопр'у БССР адасласаў на дапамогу палітвязьням капіталістычных турмаў 5000 руб., сабраных сярод працоўных БССР.

Эпідэмія тыфусу па Менскай акрузе.

За апошнія 2 тыдні па раёнах Менскай акругі выяўлены выпадкі захворваньня тыфусам.

Так, у Чэрвеньскім, Плешчаніцкім раёнах маюцца 18 выпадкаў захворваньня тыфусам і Капыльскім, Пухавіцкім і Лагойскім раёнах—6 выпадкаў.

Менскі акруговы аддзел аховы здароўя прымае хуткія меры да ліквідацыі эпідэміі.

Дапамога беднаце.

Водлуг даных ЦК камітэтаў сялянскай узаемадапамогі, у 1927 годзе па БССР налічвалася 196560 бяднацкіх гаспадарак. У мінулым годзе было аказана беднаце дапамогі ў суме 3.469.094 руб., што ў сярэднім складае па 17 руб. 64 кап. на адну гаспадарку.

Валавая прадукцыя савхозаў.

Валавая прадукцыя савецкіх гаспадарак Белсельтрасту ў бягучым гаспадарчым годзе расьце 9.937.000 руб., ці 116,4 руб. на адзін гэктар зямельнай плошчы. Між тым у мінулым годзе валавая прадукцыя складала толькі 86,6 руб. на гэктар зямельнай плошчы.

Экскурсіі ў Менск.

На днях у Менск прыбываюць з правінцыяльных тэхнікумаў студэнцкія экскурсіі. Студэнты прыедуць в Барысава, Мсьціслаўля і Чырвонага-Берага (Бабруйшчына). У Менску экскурсіі будуць знаёміцца з фабрыкамі, заводамі і культурнымі ўстановамі. Усяго прыедзе каля 120 студэнтаў.

Перападрыхтоўка настаўнікаў беларускіх школ у РСФСР.

Сёньня, 15 чэрвеня, у Менску адчыняюцца курсы па перападрыхтоўцы настаўнікаў беларускіх школ, якія знаходзяцца на тэрыторыі РСФСР.

На курсах будуць навучацца настаўнікі беларускіх школ з губерняў: Бранскай, Смаленскай, Пскоўскай, Ленінградзкай і нават з далёкага Сібіру. Усяго на курсах будзе каля 60 настаўнікаў. Курсы працягнуцца да 1-га жніўня.

Пабудова дамбы на Кашарскім пляцу.

У інспэкцыю рэспубліканскага інжынэра паступіў праэкт пабудовы дамбы на беразе ракі Сьвіслачы на Кашарскім пляцу. Гэты вялікі плац у часе васеньняга разводьдзя заліваецца вадой. Дамба дасьць магчымасьць пабудаваць на пляцу сквэр з сажалкай для спорту. Пабудова дамбы будзе каштаваць 108000 р.

Рост ячэек Мопр'у па Менскай акрузе.

У сучасны момант на Менскай акрузе налічваецца 691 ячэек Мопр'у, якія яднаюць 41318 сяброў.

З гэтай колькасьці па раёнах акругі налічваецца 484 ячэйкі, якія яднаюць — 20318 чал. і па гор. Менску—207 ячэек з ліком 21000 чалавек.

Вынікі паявой кампаніі ў с.-г. каапэрацыі.

За час з першага студзеня да 1-га чэрвеня нізавая сетка сельска-гаспадарчай каапэрацыі Менскай акругі сабрала паявых узносаў 72.386 руб., што складае 88 проц. плянавага заданьня.

Савецкія гаспадаркі дапамагаюць сялянству.

Савецкія гаспадаркі Белсельтрэсту сёлета перададуць сялянству на племя 196 галоў малочнай рагатай жывёлы, 3200 парсюкоў і 120 авечак. Набыцьцё жывёлы на племя будзе крэдытавацца па лініі сельска-гаспадарчай крэдытнай каапэрацыі.

Менскі дзень.

6 рэнтгенаўскіх апаратаў атрымаў Белмэдгандаль з Нямеччыны. Апошнія будуць разьмеркаваны паміж лекавымі ўстановамі БССР па разьвёрстцы Нар. Кам. Аховы Здароўя.

Над 19 капіталістычнымі турмамі прымаюць шэфства раённыя арганізацыі МОПР'у Менскай акругі.

З палітвязьнямі гэтых турмаў наладжана сувязь шляхам перапіскі і аказаньня матар'яльнай дапамогі.

Прыём заяў для паступленьня ў БДУ распачынаецца з 1 ліпеня. Заявы будуць прымацца да 5 жніўня.

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК.

(НА 15-VI 1928 г.).

Абл. 1 дзярж. паз.—прад. 4—59, куп. 4—57.

Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—07,5, куп. 5—05,5.

Абл. 2 сял. паз.—куп. 5.

Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—02,5, куп. 5—00,5.

Абл. 10 пр. паз. 27 г.—прад. 25—63, куп. 25—53.

Абл. дзярж. паз. 26 г.—прад. 120—25, куп. 118—25.

Абл. 12 проц. паз.—прад. 100—52, куп. 100—47.

Абл. 6 проц. паз. індустр.—прад. 24—64, куп. 24—54.

СУД.

Пайшчыку—кілё, а прыватніку—воз.

Крамай Магілеўскага ЦРК № 1 кіраваў Хаім Крэда, прадаўдом быў Зэлік Эльків, а тавар вазіў Сяргей Адамовіч. Ня глядзячы на розьніцу ў сваім становішчы, яны былі ў сьціслай прыязьні, а ў адносінах да прыватніка мелі аднолькавы напрамак. Крэда даваў сваю санкцыю і блаславеньне, Эльків—выдаваў тавар, а Адамовіч гатоў быў везьці хоць за трыдзевяць зямель. У выніку такое каардынаванае працы, тавары, замест пайшчыка, пападалі да спэкулянтаў. Найбольш апэрацый гэта «цёплая» кампанія зрабіла з пшанічнай мукой. У Элькіна была цешча, у цешчы—прыватная пякарня, а для пякарні патрэбна мука. А калі патрэбна, то і павінна быць. Дзеля чаго-ж Эльків працуе ў ЦРК? Зразумела, затым, каб дапамагчы сваёй цешчы, асабліва ў такую цяжкую хвіліну, калі ў Магілеве на муку крызіс. І мука гэтай прыватніцы, Лейбман, адпускалася зразу кашкамі, і грошы за яе ўносіліся нават ужо толькі тады, калі тавар рэалізуецца. Інвэнтар кажучы, адчыняўся крэдыт. Такім крэдытаваньнем карысталася не адна Лейбман, а і цэлы шэраг іншых прыватнікаў. Пакуль з крамы выплывалі толькі мяшкі, шыла з мяшка ніяк не магло вылезьці. Але вось адзін раз з бавіскага складу прывезьлі ў гэтую нешчасьлівую краму цэлы воз чатырохнулёвае мукі. На вазе было 20 мяшкоў. А ў краме ня было дзе зложыць. Выжэйпамянёная «тройца» доўга ня думала: калі ў краме для мукі няма прытулку, значыцца, яна і не патрэбна, а прытулінь яе найлепей у Лейбманіхі. Тамака месца заўсёды падрыхтавана загодзя.

— Сяргей! Заварачай аглоблі і пры да Элькінавай нешчы — дарога даўно відомая!

Адамовіч быў чалавек растаропны—разумеў сэнс такога загаду з аднаго «ківу—моргу». І павёз. А наглядзеўшы, што яшчэ па вуліцы занадта відна і можна выкінаць чыю-небудзь западазранасьць, ён абкружыў цэлы горад і толькі на змроку пад'ехаў да хаты Лейбман.

Аднак, гэтая асьцярожлівасьць не памагла, бо, як вядома, пшанічная мука бялее і ўпоцемках, асабліва ў тыя дні, калі за ею прыходзіцца стаяць у чарзе і атрымліваць па два кілё на кніжку. Пейская грамадзянка гэтую мэхіканую заўважыла. Пачала лаяцца: «Вось, каму кілё, а каму—зразу возам»!

Готу справядлівую і голасна з крыўдаю зробленую заўвагу пачуў якраз сумленны возчык таго самага ЦРК. Злачынства была раскрыта: у Лейбманіхі знайшлі 20 мяшкоў і яшчэ 13. Пачалі рэвізаваць каапэрацыйную краму. Пачулі аб гэтым «прыватнікі-крэдыторы» загадчыка Крэдо, сталі гасіць сваю запазычанасьць. Аднак, у канцы канцоў 227 руб. засталося непагашанымі.

За гэта злачынства Магілеўскі акруговы суд прыгаварыў да пазбаўленьня волі: Крэдо—на 3 гады, Элькіна—на 2—абодвых з суровым адмежаваньнем, а Лейбман і Адамовіча—на 1 год кожнага, дваццаць кулёў мукі вярнулася ў каапэрацыю, а 13—канфіскаваны ў прыбытак рэспублікі. Грамадзянскі іск падлягае асобнаму разгляду.

Асуджаныя гэты прыгавор аскарджылі, але Вярхоўны суд скаргу адхіліў і прыгавор зацьвердзіў. Толькі ў адносінах Адамовіча зьняволеньне заменена ўмоўным прысудам.

Шчуцкі.

У „Маладняку".

Літгурток у Нова-Барысаве.

У Нова-Барысаве з'арганізаваўся літаратурны гурток «Маладняка» ў пераважнасьці з маладых рабочых запалкавай фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна».

„Маладняк" у палатняным гарадку.

Па запрашэньню Беларускай дывізіі 10 чэрвеня Менская філія „Маладняка" правяла літаратурны вечар для чырвонаармейцаў-пераменьшыкаў у лягерах.

Літаратурны вечар у Гомелі.

20 чэрвеня, на дарозе на Украіну, маладнякоўцы сумесна з мясцовымі грамадзкімі арганізацыямі ў г. Гомелі наладжваюць вялікі літаратурны вечар.

Экскурсія на Украіну.

«Маладняк» атрымаў запрашэньне ад братняга украінскага аб'яднаньня паэтаў і пісьменьнікаў «Молодняк» прыняць удзел у сумеснай экскурсіі па Украіне.

Цэнтральнае бюро „Маладняка" ўхваліла прыняць удзел у экскурсіі і вызначыла ў экскурсію т. т. В. Каваля, А. Салагубу, Ін. Барашку, А. Звонака, А. Моркаўку, М. Нікановіча, Я. Мазуркевіча, М. Лынькова і В. Маракова.

Маладнякоўцы маюць намер прабыць на Украіне дзесяць дзён, зрабіўшы падарожжа на маршруту: Менск—Кіеў—Канів—Магіла Т. Шаўчэнкі—Днепрапятроўск—Днепрабуд—Харкаў—Менск.

У часе падарожжа будзе наладжан шэраг сумесных вечароў маладой украінскай і беларускай літаратуры.

ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ.

МЕНСКАЯ СПАРТАКІЯДА.

Баскетбольны матч—Зах. чыгунка—МББ чыгунка.

У сераду, 13 чэрвеня, на пляцоўцы «Прафінтэрн» сапталіся каманды МББ і Зак. чыгунак.

Матч скончыўся з вынікам 39:6 на карысьць выходнікаў, якія маюць зараз да поўнай перамогі толькі аднаго канкурэнта — каманду саюзу працасьветы.

Вельмі добрую гульню паказаў заходнік т. Валентовіч.

Судзіў матч т. Данцыг.

Мэталісты атрымалі перамогу.

Баскетбольны матч паміж камандамі Мэталістаў і Савгандльслужачых скончыўся перамогай мэталістаў з вынікам 23:22. Судзіў матч т. Тарасік.

Працасьветнікі—друкары.

Матч паміж камандай друкароў і адной з мацнейшых камандаў Менску саюзу Працасьветы, які адбыўся на пляцоўцы „Прафінтэрн", скончыўся перамогай працасьветнікаў (27:13).

Судзіў т. Савіч.

Адказы карэспандэнтам.

— Аўтару заметкі «Лясныя справы», (зьмешчанай ў № 66 „С. Б." ад 23-III 27 году) па абвінавачэньню Іванаўскага лясьніцтва ў несвачасовым водпуску сялянам лесу; пракуратура 2 вуч. Менскай акругі паведамляе, што справа спынена за адсутнасьцю складу злачынства.

— Аўтару заметкі «Дом Сялянина» тав Цофнае Горацкі РВК адказвае, што становішча дому кепскае з прычыны адсутнасьці сродкаў у к-це ўзаемадапамогі. Таму абсталяваньне яго і праца знаходзяцца ў кепскіх умовах і няма магчымасьці выпісваць нават и лежнай літаратуры.

— Аўтару заметкі „Дактары з Пухавіччыны" Пухавіцкі РВК паведамляе, што ў час запісаньня гэтай заметкі, загадчык урачэбнага пункту выехаў невядома куды. З гэтай прычыны справы, закранутыя ў допісу нельга высьветліць.

Апавяшчэньні.

ГАБІНЭТ ПАЛІТАСЬВЕТЫ.

16 чэрвеня, а 10 гадзіне раніцы ў памяшканьні II Дому Асьветы склікаецца канфэрэнцыя настаўнікаў вячэрніх школ рабочай моладзі і ўзвышанага тыпу з наступным парадкам дня:

1. Становішча вячэрніх школ і вынікі гадовае працы (даклад т. Хоцька).
2. Справаздача аб працы 2 школы ўзвышанага тыпу.
3. Справаздача аб працы 3-й яўрэйскай школы Рабочай Моладзі.
4. Аб арганізаваньні праграм па грамадазнаўству (дакл. т. Мазур).
5. Бягучыя справы.

Яўка настаўнікаў вячэрніх школ абавязкова. Запрашаюцца настаўнікі школ малапісьменных, а таксама і вучні вячэрніх школ.

ЛЕТНІ САД ПРАЦ. АСЬВЕТЫ.

Сёньня кіно-сэанс, — «Лявон Купюр'е». Пачатак а 10 гадзіне. У выпадку дрэннага надвор'я кіно пераносіцца ў Дом.

Выкліканая 3-я дружына парадку.

Гр-н Міратворскі Васіль Іванаў, які паходзіць з гр-н Раванскай губ. і пражывае зараз у г. Баруйску, зьмяняе сваё прозьвішча «Міратворскі» на прозьвішча «Вазоўс». Асоб, якія маюць пратасты супроць зьмены прозьвішча, просяць паведаміць аб гэтым у Бабруйскі Акруговы ЗАГС, паказаўшы сваё імя, імя бацькі, прозьвішча і месца жыцьця.

Аб арганізацыі выстаўкі да 25-цігодзьдзя 2-га зьезду партыі.

30 ліпеня—23 жніўня гэтага году спаўняецца 25 гадоў з часу 2 зьезду Р.С.Д.Р.П.

У сувязі з гэтай гадавінай Музэй Рэвалюцыі БССР пашырае выставачны матар'ял, прысьвечаны 11-му зьезду.

Для посьпеху выстаўкі неабходна максымальна выкарыстаць арыгінальнае гісторыка-рэвалюцыйныя матар'ялы пэрыяду 1900-1904 гадоў—дакументы, літаратуру, фатаграфіі і інш.

Музэй Рэвалюцыі БССР зьвяртаецца да ўсіх удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, дзеячоў бальшавіцкіх арганізацый таго часу, устаноў і прыватных асоб з просьбай прысылаць Музэю Рэвалюцыі гісторыка-рэвалюцыйныя матар'ялы паказаных гадоў па адрасу: Менск, вул. Урыцкага, № 4-а Музэю Рэвалюцыі БССР.

Прысланыя матар'ялы пасьля выстаўкі могуць быць вернуты.

МУЗЭЙ РЭВАЛЮЦЫІ БССР.

„Савецкая Беларусь" дапамагла.

ДОПІС ПАДАГНАЎ.

У допісу „КСУ аб оябуе нядбае» („С. Б." № 80, ад 4-III г.г.) „СЕЛЯНІН" пісаў, як кепска рыхтаваўся да весьнявай сяўбы Хатлянскі КСУ, Узьдзенскага р-ну, Меншчына.

Па гэтай заметцы Узьдзенскі райённы КСУ своечасова зьвярнуў увагу на працу Хатлянскага КСУ.

У выніку гэтага справа была палепшана. Хатлянскі КСУ ачысьціў 911 пудоў рознага насеньня і апрача гэтага загатаваў 100 п. насеньня, якое было выдадзена бяднейшаму насельніцтву.

ГРОШЫ ЗНАЙШЛІСЯ І ЗЬВЕРНУТЫ ПАЦЯРПЕЎШАМУ.

25-У г.г. быў зьмешчаны допіс «9 мясяцаў 7 рублёў» («С. Б.», № 119 аб цеганіне Барысаўскай райземкамісіі, якая амаль на працягу году не магла зьвярнуць беднаму гр-ну перапланаваны ім 6 р. 85 к. гэрбавага збору.

Як паведамляе Барысаўская райземкамісія, грошы ёю знойдзены і зьвернуты гр-ну Лазэрка 18 мая г. г. Грошы паступілі ў лістападзе мінулага году ад Акруговай Зямельнай Камісіі, але знаходзіліся ў агульным рахунку судовай мыты ў Барысаўскай РЗК.

ЗЛАЧЫНСТВЫ ШАПІРЫ ВЫКРЫТЫ.

У мінулым годзе рэдакцыяй «С.Б.» Бабруйскаму Акруговаму Пракурору была накіравана для расьсьледваньня селькораўская заметка—„Пад маркай арцелі". Справа расьсьледваньня зацягнулася больш, як на год.

Як цяпер высьветлілася на нарэспандэнцыі «Пад маскай арцелі» вытвараная сьледзтва і гр. АРОН ШАПІРА прыцягваецца да адказнасьці па 113 і 116 арт. Крымінальнага Кодэксу. Справа Шапіры будзе слухацца 27 чэрвеня ў Бабруйскім акруговым судзе.

ПАМЫЛКІ ПАПРАЎЛЕНЫ.

7 студзеня г. г. у № 6 «С. Б.» была зьмешчана заметка «У нага многа, таму нічэ больш». Аўтар „Селянін" скардзіўся, што Азярышчанская райземкамісія (Віцебшчына) няправільна пры лесаўпарадкаваньні разьмяркоўвала зямлю ў в. Быках, Мехаўскага с.-с.

Віцебская Акруговая Земкамісія прызнала правільным надзел 4,12 десс. памяшканьня гаспадарамі. Толькі разьмеркаваньне сельсаветам 1,63 дзесяціны запаснага фонду прапанавана РВК адмяніць і зрабіць новы надзел гэтай зямлі паміж самымі малазямельнымі сялянамі.

За сувязь з былым абшарнікам да адказнасьці.

У „С. Б." № 15, ад 18-і г. г. за подпісам подписаі сялян была зьмешчана заметка—„Сельсавет пад уплывам былога абшарнікаў". Заметка высьвятляла, што выніку хаўрусу старшыні і сэкратара Туланаўскага с.-с. з мясцовым абшарнікам Гаўсэвічам рабіліся нярэгулярныя справы ў сельсавеце. Потым рэдакцыяй была атрымана яшчэ дадатковая нарада аб с.-с. пад назвай „Закранулі — дык і на"..., якая была накіравана ў Пракуратуру Менакругі. Пракуратура зрабіла расьсьледваньне па гэтай нарэспандэнцыі. Справа расьсьледваньня накіравана цяпер у Менскі акрывыканком для прыцягненьня да адказнасьці ГАДЭЦКАГА АЛЕСЯ ў дысцыплінарным парадку.

Пляны трэба складаць рэальныя.

(Загатоўка валакна-лёну).

Загатоўка валакна ў бягучым гаспадарчым годзе вядзецца ў надзвычайна цяжкіх умовах. Наркамгандлю прыходзілася некалькі разоў зьмяняць намечаныя пляны. Пытаньне аб выкананьні плянаў па загатоўцы лёну ў свой час выклікала шмат размоў; прыходзілася выдаваць спэцыяльныя дырэктывы аб водпуску здатчыкам лёну дэфіцытных тавараў, і, урэшце, плян па загатоўцы валакна да гэтага часу ня выканан. На прычынах гэтага мы цяпер спыняцца ня будзем, бо пра гэта шмат гаварылася на старонках нашага друку і на нашых нарадах, але факт застаецца фактам, што загатоўка валакна праходзіць далёка не ў нармальных умовах. Зараз, калі ёсьць рынку канчаткова высьветлілася, калі запасы лёну больш ці менш выдомы, ня зусім зразумела тое, што наш Наркамгандлю склаў абавязковы пляч на чэрвень і ліпень, згодна якога павінна быць загатавана 1.100 тон лёну... Адкуль эканамісты і рэфэранты Наркамгандлю ўзялі гэтую лічбу,—нам невядома.

Са ўсіх пунктаў загатоўцы галосяць, што і палову гэтага нельга выканаць, але Наркамгандлю не зьвяртае ўвагі і загадвае пляны выканаць абавязкова.

Ці магчыма гэта? Бязумоўна, не, бо лён паступае зусім слаба. Можа ў гэтым часткай вінавата і наша нізавая каапэрацыя, якая дасюль „з болем у душы" адпускае здатчыкам лёну дэфіцытныя тавары, ці зусім не адпускае, як гэта мела месца ў Мазырскім раёне (у Нароўлі) і інш. мясцох. Як бы там ні было, складзены Наркамгандлем плян няжыцьцёвы і ня можа быць выканан.

Але, апроч нерэальнасьці пляну, тут ёсьць яшчэ вельмі важнае і сур'ёзнае пытаньне: гэта тое, што на падставе плянаў Наркамгандлю наша беларуская прамысловасьць, а часткай і прамысловасьць РСФСР (якой мы таксама павінны здаваць валакно) будуюць свае пляны, робяць свае каштарысы, а ў выніку... бывае тое, што намечаны плян выконваецца ў нязначным разьмеры; фабрыкі нэрвуюцца, скарджацца, бо атрымліваецца перабой у працы з-за адсутнасьці сыравіны і г. д.

Вось чаму неабходна складаць пляны, калі не дакладныя, дык, прынамсі, больш блізкія да сапраўднасьці, а ня гэткія, што ні ў якім выпадку ня могуць быць выкананы, як, напрыклад, у даным выпадку з плянам на загатоўку валакна ў чэрвені—ліпені.

Наркамгандлю БССР трэба аб гэтым падумаць сур'ёзна.

Л. Манін.

Пэрспэктывы разьвіцьця спажывецкай каапэрацыі.

Беларусь зьяўляецца спажывецкай рэспублікай, якая грунтуецца пераважна на завозных таварах, а таму ў нашых умовах задача пэрспэктыўнага плянаваньня асабліва цяжкая.

Асновай для разьвіцьця сыстэмы спажывецкай каапэрацыі ў працягу пяцёхгодзьдзя зьяўляецца рост плацежаздольнага попыту насельніцтва ў выніку ўздыму дабрабыту працоўнага насельніцтва.

Як-жа будзе расьці спажывецкая каапэрацыя?

Папершае, у сельскіх мясцовасьцях мяркуецца каапэраваць большасьць сераднякіх гаспадарак, усю беднату, батракоў і с.-г. рабочых, усё неземляробчае працоўнае насельніцтва і каля 50 проц. членаў іх сем'яў. Уцягненьне ў каапэрацыю ўсіх бяднякіх гаспадарак, батракоў і с.-г. рабочых мяркуецца правесьці ў першыя гады пяцёхгодкі. Дзеля гэтага будзе працягвацца адлічэньне па ўсёй сыстэме спажывецкай каапэрацыі ў фонд каапэраваньня беднаты.

Падругое, у гарадох БССР перад спажывецкай каапэрацыяй стаіць задача каапэраваць усіх членаў прафсаюзаў і іншых груп працоўных, якія могуць быць членамі каапэрацыі і, апрача таго, 50 проц. членаў іх сем'яў. У першыя гады неабходна будзе дасягнуць 100-процантнага каапэраваньня членаў індустрыяльных прафсаюзаў. Нашым каапэрацыйным арганізацыям неабходна будзе падумаць аб распрацоўцы мерапрыёмстваў, якія павінны дапамагчы ўцягненьню ў каапэрацыю найменш забясьпечаных рабочых.

Спажывецкай каапэрацыі прыдзецца падумаць аб павялічэньні сваіх капіталаў як у гарадзкой, так і ў сельскай сетцы. Гандлёвы зварот каапэрацыі на працягу 5 гадоў павінен разьвіцца да поўнага ахопу спажывецкага попыту каапэраванага насельніцтва. Загатоўчыя апэрацыі павінны разьвіцца таксама да максымуму.

Пры распрацоўцы 5-гадовага пляну мяркуецца адвесьці значнае месца пытаньням аграмаджваньня працэсаў спажываньня, як павялічэньне сеткі сталовак, фабрык-кухняў, пабудовы хлебазаводаў і інш.

Разам з палепшаньнем абслугоўваньня гарадзкога і сельскага спажыўца ў галіне забясьпечаньня таварамі павінна быць шырока разьвіта каапэрацыйная асьвета і культурна-бытавое абслугоўваньне каапэраванага насельніцтва.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

У рабселькора, вайскора—адна задача.

Калі рабкор на фабрыцы, заводзе, селькор—у вёсцы ставяць сваёй мэтай—дапамагаць партыі, савецкай уладзе, то і ў вайскора тая-ж задача.

Вайскоры кадра нашага № стр., палка ўжо ведаюць, як праводзіць працу ў армі. Вайскоры пераменьнік